ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 33-і
№ 92 (1937)
17 лістапада 1964
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

НАСУСТРАЧ ДЭКАДЗЕ НАРОДНАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ • ПАЧАТАК РАЗМОВЫ АБ ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ • У РЭДАКЦЫЮ ПРЫЙШЛО ПІСЬМО • ПРЫГОЖАЕ — У БЫТ • ЮБІЛЕЙ ПАЭТА • НОВЫЯ НУМАРЫ ЧАСОПІСАЎ • ПЯСНЯР ЛІТОЎСКАГА НАРОДА

Працягвае работу семінар маладых паэтаў і празаікаў. Удзельнікі семінара сустрэліся з пісьменнікамі І. Мележам, Я. Брылем, А. Вялюгіным, А. Асіпенкам, перад імі выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ А. Ваніцкі.

Маладыя літаратары наведалі літаратурныя музеі Я. Купалы і Я. Коласа, Дзяржаўны мастацкі музей БССР.

Гэты здымак зроблены ў час сустрэчы ўдзельнікаў нарады з пісьменнікамі Я. Брылем, А. Асіпенкам, А. Вялюгіным і І. Мележам.

Фота Ул. КРУКА.

ДАРОГІ Ў СВЕТ ПРЫГОЖАГА

ШКОЛА І ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

ПЫТАННЕ, якое нас хвалюе, не новае для грамадскасці. Пра неабходнасць палепшыць эстэтычнае выхаванне моладзі, асабліва школьнікаў, неаднаразова гаварылася ў друку, у літаратуры, на разнастайных нарадах і канферэнцыях. Такая цікавасць да гэтага пытання не выпадковая. У час, калі пабудова асноў камунізма стала ў нашай краіне практычнай справай, мы ўсё часцей і глыбей задумваемся над тым, якім павінен быць чалавек гэтай блізкай ужо камуністычнай будучыні.

У Праграме КПСС гаворыцца: «У перыяд пераходу да камунізма ўзрастаюць магчымасці **выхавання новага чалавека, які гарманічна спалучае ў сабе духоўнае багацце, маральную чыстату і фізічную дасканаласць».** Значыць, партыя бачыць чалавека камуністычнай будучыні не якім-небудзь аднабокім тэхніцыстам, вузкім практыкам, утылітарыстам, а асобай усебакова развітай, асобай, якой уласціва глыбіня і дакладнасць ведаў, багацце ўяўлення, палёт думкі, шырокі погляд на свет, бездакорны мастацкі густ, высакародныя рысы характару.

Фарміраванне такой гарманічна развітай асобы немагчыма без правільна наладжанага эстэтычнага выхавання. Нездарма Бялінскі гаварыў, што эстэтычнае пачуццё ёсць крыніца ўсяго цудоўнага, велічнага.

Мы адрасуем сваю размову школе. Ці трэба казаць, што іменна ад школы, ад таго, які напрамак дасць яна дзіцячай дапытлівасці, як адкажа на дзіцячую прагу ведаць, што такое добра і што такое блага, што прыгожае, а што брыдкае, — што ад усіх гэтых фактараў вельмі сур'ёзна залежыць — вырасце з дзіцяці, з падлетка натура чуйная ці глухая да прыгожага. Вырасце чалавек, які будзе садзіць дрэўцы і з трапяткім сэрцам глядзець на Леанарда да Вінчы, Рэмбранта і Рэпіна, ці чалавек, які можа абыякава зламаць маладзенькі саджанец і ўзорам хараства будзе лічыць красунь і лебедзяў з базарных кілімаў.

Было б несправядліва, няправільна не заўважаць тую немалую і цікавую работу, якую вядуць у галіне эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення многія педагагічныя калектывы і групы энтузіястаў. І ў горадзе, і на вёсцы ёсць школы, дзе, пры роўных з іншымі навучальнымі ўстановамі магчымасцях, вучні атрымліваюць намнога больш для разумення і адчування прыгожага. Але агульны стан эстэтычнага выхавання школьнікаў — будзем шчырымі — задаволіць нікога не можа.

У ШЫРОКАЙ сістэме фактараў, якія ўплываюць на эстэтычнае выхаванне школьнікаў, вельмі важнае месца займае якасць выкладання літаратуры, малявання, спеваў, фізкультуры — прадметаў, якраз і закліканых фарміраваць эстэтычнае пачуццё. У сувязі з гэтым мы лічым неабходным выказаць пярэчанне супраць аслаблення ўвагі да гуманітарных навук, якое з некаторага часу наглядаецца з боку Міністэрства асветы і падначаленых яму ўстаноў.

Зыходзячы з вельмі спрэчнай пасылкі, нібыта школьныя праграмы перагружаны, міністэрства пачало бязлітасна выкрэсліваць і абвяшчаць неабавязковымі для кволых вучнёўскіх мазгоў найцікавейшыя часы і нават цэлыя эпохі айчыннай і сусветнай літаратуры і гісторыі.

Не ўладальніцай народных дум і вяшчальнікам праўды, дабра, сумлення паўстае літаратура ў некаторых школьных падручніках, праграмах і метадычных распрацоўках, а сумнай памінальніцай імёнаў, фактаў, вобразаў. І калі пры аналізе бібліятэчных абанементаў пераконваешся, што творы класікаў, гігантаў нашай літаратуры чытаюцца сёння зусім не так заўзята, як чыталіся ў такім узросце старэйшымі пакаленнямі, то пачынаеш разумець, што аўтары скарочаных школьных праграм і падручнікаў ніяк не з'яўляюцца дабрадзеямі.

Збедненая, звужаная літаратура і выкладаецца да таго ж вельмі часта прымітыўна, нудна. Дыскусіі аб паляпшэнні выкладання літаратуры пераходзяць з газеты ў газету, з часопіса ў часопіс. Пісьменнікі, педагогі, нават самі вучні прыводзяць дзесяткі, сотні прыкладаў таго, як няўмелае выкладанне ў школе, не ўзнімае, а гасіць любоў да кнігі ў вучнёўскіх сэрцах. Але артыкулы друкуюцца, прачытваюцца, абмяркоўваюцца, а становішча застаецца тое ж самае.

Калі так адносяцца ў школе да літаратуры, то што ўжо гаварыць пра такія прадметы, як маляванне і спевы. Яны наогул лічацца малаважнымі, другараднымі. Выкладаюць іх часцей за ўсё настаўнікі без спецыяльнай адукацыі, якім даручылі весці гэтыя прадметы ў якасці «дагрузкі». Добра, калі гэтая «дагрузка» хоць у нейкай ступені адпавядае схільнасцям настаўнікаў. У бацькі касманаўта Германа Цітова Сцяпана Паўлавіча таксама не было спецыяльнай адукацыі, але ён меў у сэрцы вялікую любасць да мастацтва і іскры яе запальвалі гэткай жа любасцю і сэрцы вучняў. Але ж агонь найчасцей загараецца ад агню! А ці ёсць ён у кандыдата на выкладанне гэтых прадметаў— гэтым дырэктары школы і загадчыкі райана пры размеркаванні «дагрузкі» цікавяцца вельмі рэдка.

ВЫКЛІКАЕ трывогу шырокае распаўсюджанне сярод моладзі нават не лёгкай, а нейкай аблегчанай музыкі. Чалавек, які сістэматычна прысутнічае на аглядах самадзейнасці, не можа не заўважыць, што ў аглядах гэтых усё меншае і меншае колькасць калектываў і асобных выканаўцаў, якія выступаюць з народнымі песнямі і танцамі, з творамі класічнай музыкі, і ўсё больш і больш бывае розных так званых эстрадных ансамбляў, джазаў, квартэтаў, квінтэтаў, спевакоў і спявачак, якія пераймаюць рэпертуар і манеру выканання далёка не лепшых узораў зарубежнай музыкі, а то і музыкі рэстараннай эстрады.

Могуць спытацца — пры чым тут школа? Адкажам: школа, безумоўна, павінна ўзяць на сябе частку віны. І немалую. Дзе, як не ў сценах школы, фарміруецца першае ўяўленне аб тым, якая музыка, якая песня, які танец прыгожыя, а якія — не.

Беларускі дзяржаўны універсітэт славіўся некалькі гадоў назад сваім хорам. Сёння яго тут няма — не набіраецца патрэбная колькасць удзельнікаў. Няма хору і ў другой буйнейшай вну рэспублікі — політэхнічным інстытуце. Зноў жа з-за недахопу спевакоў. У той жа час ахвотнікаў удзельнічаць у джазах тут— хоць конкурс абвяшчай. Дык што ж гэта — збяднела наша моладзь на галасы? Не, проста ў сённяшніх студэнтаў, учарашніх школьнікаў, не выхаваны пашана і любоў да народнай, матчынай песні, не выпрацаваны імунітэт супраць той музычнай пошласці, што, як хвароба, кідаецца на няўстойлівых.

Вядома, папракаючы школы, трэба кінуць дакор і канцэртным арганізацыям, радыё і тэлебачанню, фабрыкам пласцінак — усім прадпрыемствам і ўстановам, якія займаюцца прапагандай музыкі. Тое, што прапануюць яны вушам і вачам нашых дзяцей, нярэдка зусім закрэслівае пачутае імі ў школе і не спрыяе не толькі выхаванню добрага густу, а нават проста цвёрдай маралі.

Эстрадныя пляцоўкамі і канцэртнымі залямі гарадоў завалодалі славутыя «шаптуны» — манерныя выканаўцы, якія не ўяўляюць выступлення без мікрафона, — і адпаведныя ансамблі суправаджэння. Нібы ў насмешку над сапраўдным мастацтвам, нават з-за мяжы запрашаюцца да нас эстрадныя спевакі і калектывы далёка не першага гатунку.

Органы народнай асветы не наладзілі патрэбнай сувязі з радыё, тэлебачаннем, кінапракатам. У эфіры і з экрана таксама нярэдка гучыць музычная пошласць. Кажуць, што выконваецца гэтая пошласць па просьбе слухачоў. Але ж бяздумнае выкананне нават самых шматлікіх заявак на модны «шлягер» выклікае новы паток такіх самых заявак. Значыць, думаць трэба не столькі аб тым, каб іх задаволіць, колькі аб тым, каб выхоўваць нецярпімасць да саладжавай музычнай атруты.

Калі такіх папрокаў заслугоўваюць установы, дзе ёсць спецыяльныя музычныя рэдакцыі з кваліфікаваных работнікаў, дык што казаць пра музыку ў парках, фае кінатэатраў, чыгуначных вагонах!..

Але ж прапанова дыктуецца попытам. І тут узнікае пытанне: чаму ж учарашні ды і сённяшні школьнік так хіліцца часамі да гэтай благой музыкі? Чаму ён не вельмі ахвотна ідзе ў філармонію, калі там выступае сусветна вядомы скрыпач ці піяніст, і ў той жа час праўдамі і няпраўдамі стараецца трапіць на канцэрт «шаптуна»? Чаму выключае радыё, калі гучыць Чайкоўскі, і аж прытанцоўвае, пачуўшы нават самы нехлямяжы джазік?

Прыміце ўсё гэта, таварышы настаўнікі, як дакор сабе. Тым больш, што нешта падобнае адбываецца сярод часткі школьнікаў і з чытаннем мастацкай літаратуры. Тое, што яны чытаюць, чым захапляюцца — розныя «шпіёнскія» аповесці — мастацкай літаратурай не назавеш. А бібліятэкі ў лепшым разе не выдаюць пэўныя кніжкі недарослым чытачам (нічога, яны іх возьмуць у старэйшых таварышаў!), і толькі ў рэдкіх школьных бібліятэках разумна кіруюць чытаннем, выхоўваюць любоў да сапраўдных здабыткаў літаратуры.

У НАС ЗУСІМ няма жадання кінуць цень на наша настаўніцтва. Мы ведаем пра сотні, тысячы энтузіястаў, якія робяць, прытым вельмі добра робяць, высакароднейшую з работ—абуджаюць у чалавеку пачуццё хараства, пакланенне хараству, вучаць яго жыць, будаваць, ствараць па няпісаных законах гэтага самага хараства. Бо, як казаў Горкі, «чалавек па натуры сваёй — мастак. Ён усюды, так або інакш, імкнецца ўносіць у сваё жыццё прыгажосць».

Але, паклаўшы руку на сэрца, глянем — колькі ж у нас яшчэ настаўнікаў, пазбаўленых пачуцця прыгожага, адсталых, закасцянелых у сваіх уяўленнях аб сапраўднай прыгажосці, а часам — проста малаадукаваных.

Вопытны выкладчык малявання, цудоўны педагог, якому абавязаны знойдзеным прызваннем многія мастакі, з трошкі сумнай усмешкай расказваў аднаму з нас пра нечаканасці, з якімі даводзіцца яму сутыкацца. Напрыклад, доўга і настойліва навучаў ён сваіх выхаванцаў адчуванню светаценю, паказаў ім, між іншым, што снег ніколі не бывае белым — у залежнасці ад надвор'я, ад асвятлення, ад колеру блізкіх прадметаў ён прымае пэўныя адценні, якія трэба толькі ўмець убачыць. Неўзабаве ў школе ў сачыненні адзін з яго вучняў напісаў, што снег каля лесу быў фіялетавы. Выкладчыца літаратуры, якая правярала работы, падкрэсліла слова «фіялетавы» чырвоным алоўкам, напісала зверху «белы» і знізіла вучню ацэнку...

Прыклад сам па сабе не такі ўжо абуральны, можа, нават дробязны, але даволі характэрны і паказальны. Эстэтычная глухата некаторых настаўнікаў недастаткоўная, часам нават мізэрная дасведчанасць іх у пытаннях выяўленчага мастацтва, музыкі, тэатра, нават літаратуры — на жаль, даволі пашыраная з'ява.

Гэта ж факт, што ёсць настаўнікі—часам нават выкладчыкі мовы і літаратуры! — начытанасць якіх не выходзіць за рамкі кола аўтараў і твораў, уключаных у школьныя падручнікі. Ды і тое чыталася яшчэ некалі, у студэнцкія гады.

Гэта ж факт, што ёсць студэнты педагагічных вну — і стацыянара, і завочных аддзяленняў — якія за гады вучобы так і не выберуць дня, каб схадзіць у мастацкі музей і філармонію. А ім жа пасля атрымання дыплома быць дзе-небудзь у вёсцы асноўнай культурнай сілай...

ШЫРОКА вядома выказванне К. С. Станіслаўскага: тэатр пачынаецца з вешалкі. Перафразіруючы яго, дазволім сабе сказаць: эстэтычнае выхаванне пачынаецца з колеру школьных сцен.

Колькі прарніла спісана, колькі гарачых слоў сказана аб тым, што школа ўжо знешнім сваім выглядам павінна выхоўваць пачуццё прыгожага! Але і да гэтага часу вельмі часта бывае — зойдзеш у школьнае памяшканне і дзіву даешся — такая тут безгустоўнасць, крыклівасць, непрадуманасць у падборы фарбаў, у выбары месца і самім выглядзе ўсялякіх стэндаў, плакатаў, вітрын. Нібы дырэктар дбаў толькі аб адным — як бы выдаткаваць паболей грошай і як бы скарыстаць усю бронзу і фольгу, што мелася ў раённай гандлёвай сетцы ў момант рамонту.

Мастака, чалавека з добрым і прафесіянальным густам — вось каго не хапае школам у час будаўніцтва і рамонту. А вока і парада такога чалавека вельмі патрэбны! Тым больш, што інструкцыі, якімі кіруюцца ў школах у час гэтых работ, даўно ўжо ўстарэлі.

Кожную школу, асабліва сельскую, хацелася б бачыць у засені зялёных прысад. Ці трэба казаць, што чалавек, які не адчувае, не разумее і не ведае прыроды, збеднены, пазбаўлены нечага надзвычай вялікага. Любасць да роднага краю, да сціплага, але надзвычай глыбокага і ў кожным разе непаўторнага яго хараства часта пачынаецца менавіта з замілаванасці да бярозкі, ліпкі ці яблынькі, якую пасадзіў сваімі рукамі, водару квецені, якім дыхаў ў школьную вясну. Чаму ж, у такім разе, некаторыя выканкомы раённых Саветаў так скупа выдзяляюць для школьных участкаў зямлю не болей аднаго гектара (дарэчы, і гэты ўчастак часта кепска дагледжаны!). А чаму не тры, не пяць гектараў? Няхай пры школах шумяць зялёнымі кронамі паркі, няхай школа вабіць да сябе і малых і старых не толькі як месца, дзе вучаць чытаць і пісаць, а наогул як важнейшы асяродак культуры.

Пакуль што гэтага, на жаль, няма. Пакуль што — і няхай гэта прагучыць дакорам адпаведным мясцовым Саветам і праўленням калгасаў — у нас нават не ўсе школы маюць свае памяшканні. Ёсць і такія, што да гэтага часу туляцца ў прыватных хатах. І тут ужо не пра эстэтычнае выхаванне даводзіцца гаварыць, а пра элементарныя ўмовы для заняткаў...

ДУМАЕЦЦА, больш значна больш дапамагаць школе могуць працаўнікі літаратуры і мастацтва.

Заслугоўваюць самай шырокай удзячнасці артысты, мастакі, музыканты, якія сябруюць з пэўнымі школьнымі калектывамі, памагаюць вучнёўскай самадзейнасці, знаходзяць час для гутарак, сустрэч, заняткаў з юнымі прыхільнікамі мастацтва.

Добрыя, жаданыя і частыя госці ў сярэдняй школе № 2 Мінска артысты Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Колькі роздуму, колькі гарачых спрэчак аб месцы мастацтва ў жыцці, аб мастацтве сапраўдным і фальшывым выклікалі сустрэчы і размовы з імі сярод вучняў.

Любоў Дзмітрыеўна Вельбе, у маладосці артыстка балета, даўно пакінула сцэну. Але не будзе перабольшаннем сказаць, што яна паранейшаму актыўна жыве ў мастацтве — дастаткова пазнаёміцца з вялікай работай па эстэтычнаму выхаванню, якую вядзе яна ў Рэчыцы — і сярод школьнікаў, і сярод больш сталай моладзі.

Сярод мінскіх школьнікаў і педагогаў добра вядома імя мастака Сяргея Пятровіча Каткова, які нястомна і ўмела выхоўвае любоў да выяўленчага мастацтва ў сэрцах усё новых і новых пакаленняў дзяцей.

Можна яшчэ і яшчэ прыводзіць падобныя прыклады. Але ўсё-такі гэта — асобныя прыклады. А хочацца гаварыць аб сталай сувязі Міністэрства асветы з творчымі саюзамі, з Беларускім тэатральным аб'яднаннем. Хочацца гаварыць аб іх сумесных намаганнях у выхаванні чалавека, вартага быць будаўніком і паўнапраўным членам грамадства, да якога мы ідзём. Формы гэтай сувязі, мабыць, трэба спецыяльна абмеркаваць і вызначыць.

ЗАКАНЧВАЮЧЫ свае нататкі, выказваем прапанову пачаць размову па ўзнятых у гэтых нататках пытаннях.

Няхай на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» выступяць настаўнікі, выкладчыкі вну, працаўнікі літаратуры і мастацтва, нядаўнія выпускнікі школ — усе, каго хвалюе выхаванне новага чалавека, такога чалавека, аб якім гаворыцца ў Праграме КПСС.

Няхай выкажуць яны сваю думку аб тым, ці адпавядае задачам выхавання гэтага чалавека арганізацыя навучальнага і выхаваўчага працэсу ў нашых школах. Ці дастатковую падрыхтоўку для выканання гэтай высакароднай задачы атрымліваюць у вну будучыя настаўнікі? Што можна зрабіць, каб і пры тых аб'ектыўных умовах, якія існуюць цяпер, школа давала сваім вучням і шырэйшы кругагляд, і больш тонкі густ, і багацейшыя веды ў мастацтве і літаратуры, і прагу да сапраўднай прыгажосці?

Добра было б, каб людзі, якія непасрэдна займаюцца эстэтычным выхаваннем школьнікаў, выказалі меркаванне, ці правільна ў нас пашыраецца станоўчы вопыт энтузіястаў гэтай справы і як лепей можна яго пашыраць.

Добра было б, каб і сам вопыт быў абагулены ўдзельнікамі размовы — яна зрабілася б тады своеасаблівай скарбонкай цікавых, вартых пашырэння пачынанняў, спроб, прапаноў.

Думаем, што такая размова прынясе вялікую карысць і дапаможа зрушыць да лепшага справу, у якой надзвычай зацікаўлены і школа, і бацькі, і самі вучні, і ўся грамадскасць.

П. ГЛЕБКА, І. ШАМЯКІН, пісьменнікі; Я. ЦІКОЦКІ, кампазітар, народны артыст СССР; Р. Шырма, народны артыст СССР; З. АЗГУР, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР, народны мастак БССР; Н. ВОРАНАЎ, в. а. старшыні праўлення Саюза мастакоў Беларусі; Ул. ДЗЯДЗЮШКА, народны артыст БССР.

Насустрач дэкадзе народнай творчасці

ТАЛЕНТЫ НАРОДНЫЯ

Да трэцяй рэспубліканскай Дэкады народнай творчасці засталося менш паўгода. Часу не так і багата. Самадзейныя мастакі і народныя ўмельцы рэспублікі актыўна рыхтуюцца да гэтага агляду нашай культуры.

Ад абласных дамоў народнай творчасці ў Мінск паступіла больш 400 новых работ народных умельцаў. Праведзены з самадзейнымі майстрамі семінары, дадзены кансультацыі і парады. Хачу падкрэсліць, што двух-трохдзённых, нават дзесяцідзённых семінараў усё ж недастаткова. Неабходна арганізаваць практычныя семінары тэрмінам на месяц—два (з адрывам ад вытворчасці), каб на іх падрабязна абмяркоўваліся эскізы і ствараліся тэматычныя карціны, скульптуры, графічныя серыі. Гэта ўзняло б ідэйна-мастацкі ўзровень творчасці мастакоў.

Падрыхтоўка і правядзенне раённых, гарадскіх і абласных выставак народнай творчасці вялася і вядзецца досыць актыўна. Нараджаюцца новыя формы прапаганды народнай творчасці. Прыкладам можа быць арганізаваная ў Гродзенскім абласным Доме народнай творчасці выстаўка работ народных умельцаў толькі адной вёскі (Збляны Лідскага раёна). На мой погляд, варта было б экспазіцыю вёскі Збляны цалкам паказаць на будучай рэспубліканскай выстаўцы ў Мінску.

Гомельскі Дом народнай творчасці праводзіў творчы семінар самадзейных мастакоў па гатовых работах і эскізах. Поспехам у час семінара карысталіся новыя творы М. Івінскага з Жлобіна і Д. Сталярова з вёскі Каменка Рагачоўскага раёна. Яны выступілі ў тэхніцы разьбы па дрэву. Першы з іх паказаў кампазіцыю «Над прасторамі Радзімы»—пра мантажнікаў-высотнікаў і «Не забудзем, не дарэм». Другі—выразную па характарыстыцы і пластыцы работу «Дняпроўскі рыбак», кампазіцыю «Беларуская лірычная», шэраг гумарыстычных і сатырычных мініяцюр у народным духу. Зараз М. Івінскі працуе над новымі творамі. Гэта — цікавы чарнільны прыбор, які ўяўляе сабой тэматычную кампазіцыю, прысвечаную паказу багацця і прыгажосці роднай прыроды; ваза ў паўтара метра вышыні — «Багацце»; шматфігурная кампазіцыя «Афрыка». Серыю натурных эцюдаў-эскізаў М. Івінскі прысвячае беларускім сталярам.

У Гомельскім Доме народнай творчасці студыя мае аддзяленні скульптуры, жывапісу і графікі. Студыйцы рыхтуюць цікавыя тэматычныя серыі. Аднак, на жаль, там не хапае прафесіянальнага кіраўніцтва ў галіне скульптуры, бо ў Гомельскім аддзяленні Саюза мастакоў БССР няма ніводнага скульптара. Трэба, каб праўленне Саюза мастакоў рэспублікі рэкамендавала мінскага скульптара для пастаяннай дапамогі самадзейным майстрам Гомеля.

Цікавыя работы і ў магілёўскіх самадзейных мастакоў. Разбяр па дрэву В. Валкавой стварыў тэматычную лірычную кампазіцыю «Ленін», а таксама серыю работ з народнага гумару і сатыры («Тоўсты і тонкі», «Бочка», «Спартсмены», «На вечарынку» і іншыя). Самадзейны жывапісец з Глуска І. Булгакаў стварыў палотны «Калгасны статак», нацюрморт «Дарункі прыроды» і шэраг пейзажаў. І. Ячмянкоў (Глуск) выразаў з дрэва шолахаўскага дзеда Шчукара.

Значную работу па выяўленню народных талентаў праводзяць мінскія гарадскі і абласны дамы народнай творчасці. На рэспубліканскай выстаўцы гледачы ўбачаць цікавыя творы скульптара К. Машукова («Будаўнік камунізма»), разбяроў па дрэву Л. Шостак, С. Гуткоўскага, А. Царкоўскага.

Многа і паспяхова працуюць самадзейныя жывапісцы Міншчыны. Ф. Хадасоўскі стварыў серыю пейзажаў Беларусі — яго персанальная выстаўка экспанавалася ў кінатэатры «Ракета». В. Ягела—знаўца ўсіх уласцівасцей бярозы. Ён стварае з гэтага дрэва кубкі, пацеркі, гузікі, бранзалеты, разнастайныя дробныя вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Гравюры на лінолеуме С. Козак, адмысловыя творы «лясной скульптуры», якія стварае архітэктар А. Левін,— таксама сведчанне разнастайнасці і багацця народных талентаў Міншчыны.

Многа цікавага рыхтуюць народныя майстры Віцебшчыны і Брэсшчыны.

І яшчэ адна важная падзея адбудзецца ў час падрыхтоўк да Дэкады. Мы будзем мець па сутнасці цэлы Музей народнай творчасці—тры залы ў новым памяшканні Гістарычнага музея рэспублікі.

У заключэнне хачу выказаць заўвагі па арганізацыі Рэспубліканскай выстаўкі народнай творчасці.

Мне здаецца, экспазіцыя абавязкова павінна быць арганізавана па абласцях: кожная—асобна. Пажадана таксама, каб кожная вобласць самастойна рабіла сваю экспазіцыю з улікам сучасных патрабаванняў і наяўнасці экспанатаў, ухваленых выстаўкомам або мастацкім саветам РДНТ. Гэта дасць магчымасць убачыць слабыя і моцныя бакі работы абласных дамоў народнай творчасці.

І яшчэ адно. Трэба загадзя паклапаціцца пра складанне і надрукаванне каталога выстаўкі.

Мікалай ТАРАСІКАЎ,
мастак, старшы метадыст па выяўленчаму мастацтву РДНТ.

СПЯВАЕ МУЖЧЫНСКІ ХОР

Кіраўнікі хораў звычайна скардзяцца, што не хапае мужчынскіх галасоў. А вось у Лані (калгас «Ленінскі шлях»), што на Нясвіжчыне, пяцьдзесят мужчын аб'ядналіся ў харавы калектыў. Спяваюць у хоры настаўнікі П. Курачыцкі, В. Гумінскі, А. Плакса, М. Чычко, Г. Пузіноўскі, ляснік Ф. Буглай, старшыня сельсавета В. Гуль, трактарыст Ул. Галабурда, шафёры М. Гладкі і М. Калоша, калгаснікі П. Максімовіч, П. Дашко, Р. Галабурда, Л. Страцкевіч і многія іншыя. Кіруе хорам выкладчык спеваў мясцовай школы Ул. Пяшкур.

У рэпертуары хору—шмат песень савецкіх кампазітараў і беларускіх народных песень. Хораша спяваюць тут песні «Ленін заўжды з табою», «Дубок», «Лясную песню», «Баладу пра Заслонава», «Нам жыць пры камунізме», «Зямля родная».

І. ТАРТОЎСКІ.

ПРЭМ'ЕРЫ Ў НАРОДНЫХ КАЛЕКТЫВАХ

Напружанае творчае жыццё пануе ў гэтыя дні ў самадзейных драматычных калектывах рэспублікі. Аматары сцэны рыхтуюць новыя спектаклі, сцэны, гумарэскі, якія яны пакажуць у дні III Дэкады самадзейнага мастацтва Беларусі.

Вялікую дапамогу самадзейным артыстам аказваюць гарадскія і абласныя дамы народнай творчасці. Яны арганізоўваюць семінары, кансультацыі, сустрэчы з майстрамі прафесіянальнай сцэны. На шасцідзённы семінар кіраўнікоў народных тэатраў і драматычных калектываў Мінскай вобласці былі запрошаны рэжысёр Тэатра імя Масавета заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР А. Шапс, народны артыст БССР С. Бірыла, заслужаны артыст Казахскай ССР В. Галубовіч. Кансультацыю па майстэрству акцёра правёў заслужаны артыст БССР П. Іваноў. (Здымак злева).

Артысты народнага тэатра Мінскага аўтазавода паставілі спектакль «Даходнае месца» А. Астроўскага. Ролі Жадаева і Поленькі з поспехам выканалі Станіслаў Дробыш і Соф'я Вашкевіч (здымак у цэнтры).

А калектыў народнага тэатра пры Бабруйскім клубе мясцовай прамысловасці паставіў спектакль «Платон Крэчат» (здымак справа).

Пастаноўку ажыццявіў рэжысёр народнага тэатра Б. Шурын. Мастацкае афармленне І. Чумакова.

Галоўныя ролі ў спектаклі выконваюць Е. Кіявіцкі, А. Казьякова, Л. Ільін, В. Бакумец, В. Стаўроўская, Г. Эпштэйн.

Першымі гледачамі і крытыкамі новай работы аматараў сцэны былі слухачы народнага універсітэта эстэтычнага выхавання горада.

Да III Дэкады самадзейнага мастацтва калектыў Бабруйскага народнага тэатра рыхтуе спектакль «Свет далёкай зоркі».

Фота В. БАРХАТАВАЙ і А. ГОЛЫША.

Шостая рэспубліканская

У мэтах шырокай прапаганды поспехаў камуністычнага будаўніцтва і дасягненняў беларускага народа ў выкананні сямігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР, Міністэрства культуры БССР вырашыла арганізаваць шостую рэспубліканскую мастацкую фотавыстаўку «Сямігодка ў дзеянні». Выстаўка будзе адкрыта ў маі 1965 г.

Створаны арганізацыйны камітэт па адбору работ на шостую Усесаюзную мастацкую фотавыстаўку і правядзенню шостай рэспубліканскай мастацкай фотавыстаўкі «Сямігодка ў дзеянні».

На выстаўку прымаюцца работы, якія адлюстроўваюць дзейнасць савецкага народа па выкананню рашэнняў XXII з'езда КПСС, чэрвеньскага і снежаньскага Пленумаў ЦК КПСС 1963 г., дасягненні працоўных Беларусі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі, тэхнікі, культуры і мастацтва. Будзе арганізаваны спецыяльны аддзел, у экспазіцыю якога ўвойдуць творы, прысвечаныя дваццацігоддзю Дня перамогі над фашызмам.

У РЭДАКЦЫЮ ПРЫЙШЛО ПІСЬМО...

АДКАЗ АНАНІМУ

У рэдакцыю прыйшло пісьмо. Яго аўтары абвінавачвалі кіраўніка кінасеткі Гомельскага раёна Я. Румаеўскага ў тым, што той «груба абыходзіцца з падначаленымі, на рабоце лае нецэнзурнымі словамі старых і маладых. За крытыку расправа—звальненне з работы». Кожны радок пісьма з болем расказваў аб развале кінасеткі, патрабаваў неадкладнага ўмяшання. Уявіце сабе: «...Румаеўскі Я. А. купіў за 1000 рублёў матацыкл М-72 для дырэкцыі кінасеткі Гомельскага раёна і адразу з магазіна забраў яго дадому і паставіў на кансервацыю... Пры правільным карыстанні гэты матацыкл сябе даўно б апраўдаў і даў бы яшчэ значны прыбытак. Напрыклад, перавозка кінастужак. Аўтамашына ідзе па кальцы і перавозіць адзін-два кінафільмы вагою не больш пяцідзесяці кілаграмаў, што эканамічна нявыгадна»... Румаеўскі «пайшоў на тое, што рэгулярна, кожны месяц спісвае пэўную колькасць бензіну і аўтолу, а грошы пры садзеянні бухгалтара прысвойвае сабе».

Шэсць старонак, спісаных сціслым почыркам, падрабязна пералічалі ўсе непрыстойныя справы Я. Румаеўскага. Пісьмо было падпісана: «кінамеханікі Л. Корхаў і Н. Булін».

Першы вывад з пісьма — Я. Румаеўскі яўна не на сваім месцы, пад яго кіраўніцтвам справы ў сельскай кінасетцы пайшлі вельмі дрэнна. Асцярожна пытаюся ў абласным упраўленні кінафікацыі, ці так гэта. І раптам — шчыры і дакладны адказ:

— Румаеўскі — вопытны кіраўнік. З яго прыходам справы пайшлі значна лепш—умацавалася дысцыпліна, раён пачаў выконваць фінансавы план, значна радзейшымі сталі зрывы кінасеансаў. А гэта, вядома, не падабаецца сяму-таму...

Каму ж? Корхаву і Буліну? Не, яны, як толькі пазнаёміліся са зместам пісьма, узялі па лістку паперы і паспешліва напісалі:

«...Я яго (пісьма) не пісаў і пра многія факты, якія прыводзяцца ў пісьме, не маю ніякага ўяўлення. Корхаў».

«...пісьмо пра так званыя дрэнныя ўчынкі Румаеўскага я не пісаў... Булін».

Толькі на першы погляд можа здацца, што гэтая гісторыя пачалася нядаўна. У сапраўднасці ж...

Кінафікатары Гомельскага раёна некалі славіліся па ўсёй рэспубліцы сваімі добрымі справамі. Тут упершыню былі арганізаваны стацыянарныя сельскія кінаўстаноўкі, наладжаны строгія графікі, пачаў сістэматычна перавыконвацца план. Раён узнагароджваўся пераходнымі сцягамі, атрымліваў прэміі.

Некалькі гадоў назад раён узбуйнілі—далучылі да яго Веткаўскую зону. І справы адразу пайшлі значна горш. Выявіліся вялікія непаладкі і нават злоўжыванні некаторых работнікаў далучанай зоны. Я. Румаеўскі прыняў рашучыя захады да іх ліквідацыі. Вось тады і пачалася гісторыя, у выніку якой і з'явілася пісьмо ў рэдакцыю. Зрэшты, і да гэтага пісьма трывожныя сігналы паступалі ў іншыя рэдакцыі, і кожны раз яны былі падпісаны чужымі прозвішчамі.

На самай справе, хіба магла быць па душы цвёрдая дысцыпліна веткаўскаму кінарамонтнаму майстру Крывашэю? Да ўзбуйнення раёна ён быў сам сабе гаспадаром—п'янстваваў, свядома завышаў час, неабходны для таго, каб аўтамашына магла зрабіць кальцо па раёну. У гэтыя «лішнія» гадзіны шафёр С. Рабікаў «лявачыў», а зароблены такім чынам грошы дзяліў з рамонтным майстрам. Раён не выконваў плана, зрываліся сеансы, у некаторых вёсках месяцамі не бачылі кіно.

Хіба мог прыняць новыя парадкі той жа шафёр С. Рабікаў, якога пазбавілі магчымасці халтурыць.

Або іх сябра—кінамеханік Веткаўскага Дома культуры Н. Галкоўскі? Цяпер жа і ад яго патрабавалі і якасці работы, і добрасумленных адносін да яе.

Вось тады і пачаліся скаргі, тады і пачалася гэтая гісторыя. Працавалі камісіі, праверка ішла за праверкай, скаргі, падпісаныя чужымі прозвішчамі, не пацвярджаліся. А ананім усё не сунімаўся...

Аднак вернемся да апошняга ананімнага пісьма. Дакументы неабвержна паказваюць: больш года назад матацыкл быў перададзены раённаму аддзелу культуры і цяпер знаходзіцца ў Свяцілавічах. Ніякіх злоўжыванняў Румаеўскі не рабіў. Ананімны аўтар у сваім пісьме паведамляе, што Я. Румаеўскі п'янствуе. «...П'е не за свае грошы, а схіляе асобных кінамеханікаў, якім давярае». Няёмка было пра гэта пытаць у людзей, але я пытаўся. І той жа Корхаў адказаў: не ведаю такіх выпадкаў. І іншыя гавораць тое ж.

Яшчэ цытата з пісьма: «Незаслужаным рэпрэсіям падвяргаліся ў розны час рамонтны майстар Крывашэй, кінамеханікі Мільячэнка, Галкоўскі, Каржоў, Хрушчоў, Рачкоў, а таксама шафёр Рабікаў...» Праўда, гэтыя людзі мелі адміністрацыйныя спагнанні за нядобрасумленныя адносіны да работы. Крывашэй, зразумеўшы, што бесклапотнае жыццё скончылася, звольніўся, іншыя працуюць. І, улічыўшы памылкі, працуюць лепш—значыць, спагнанні пайшлі на карысць.

Думаю, не варта пералічаць усе выдумкі ананіма. Лепшы адказ яму—сённяшнія справы кінасеткі. З пачатку года яна сістэматычна выконвае фінансавы план. Дваццаці лепшым работнікам кінасеткі прысвоена званне ўдарнікаў камуністычнай працы, дзве брыгады сталі камуністычнымі. Умацавана Веткаўская зона. Рамонтным майстрам тут прызначаны камуніст Н. Вішталь. Адкрыта сем шырокаэкранных кінаўстановак. Сістэматычна дэманструюцца сельскагаспадарчыя фільмы, уведзены строгі графік, усе кінамеханікі аб'яднаны ў брыгады. За кожным гэтым фактам—вялікая і старанная работа. Вы гэта ведаеце, аўтар пісьма. Я ўяўляю, колькі непрыемных хвілін прынеслі людзям вашы паклёпы, колькі рабочага часу адабралі вы ў іх. Але, запэўняю вас, колькі вяровачцы не віцца, канец будзе. Выцягнуць вас на святло, і тады я не зайздрошчу вам. Подласці не даруюць.

Разлік у ананіма—пры ўсёй яго хітрасці — быў просты. У рэдакцыі прачытаюць пісьмо, ухопяцца за «абуральныя» факты і надрукуюць. Вось тады пакруціцца Румаеўскі і, калі нават абвінавачванні не пацвердзяцца, усё ж, на думку ананіма, ён панервуецца.

А калі пісьмо не надрукуюць? Таксама нядрэнна. «Сігнал» быў, подпісы пад пісьмом ёсць—значыць, прыедзе карэспандэнт і зноў Румаеўскаму будуць вымотваць нервы. А аўтар пісьма, «праўдалюбец», будзе ўхмыляцца і збіраць новыя «факты»—а мо ў іншым месцы пашанцуе.

Вельмі цікава было б знайсці гэтага чалавека, але зрабіць гэтага я, на жаль, не здолеў. Палахлівец, як і належыць яму, з прыкрытага месца назірае за полем бою. І мне вельмі хочацца хоць зараз звярнуцца да яго.

Вы лічыце сябе бясстрашным барацьбітом з недахопамі, вы абвінавачваеце і ганьбіце. Вы называеце сябе савецкім чалавекам, спекулюеце высакароднасцю нашага народа, яго сумленнасцю і непрымірымасцю, заклікаеце сумленна працаваць. Вельмі вам хочацца, каб у вашу «праўду» паверылі. Запэўняю, гэтыя мары не збудуцца. Паміж вашай «праўдай» і праўдай савецкай—бяздонне, і як бы вы ні стараліся—вам не ўдасца пабудаваць над ім мост. Гэта вельмі несумяшчальныя паняцці—мараль баязліўца і нягодніка і мараль сумленнага чалавека.

Вельмі шкада, што яшчэ сям-там у нашым грамадстве прытаіліся паклёпнікі, прытаіліся, каб укусіць або хоць пабрахаць з-за вугла. І не ім, палахлівцам, гаварыць: «Мы, савецкія людзі...» Свет ведае савецкіх людзей—аратых і будаўнікоў, вучоных і пакарыцеляў космасу. Свет прывык верыць савецкім людзям. А вам, ананіму-паклёпніку, веры не было і не будзе.

Д. РАДЗІНСКІ.

Мал. М. ЛІСОЎСКАГА.

ЯЗЭПУ СЕМЯЖОНУ — 50 ГАДОЎ

Учора споўнілася 50 год Язэпу Семяжону. Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Язэп Ігнатавіч!

Нам, беларускім пісьменнікам, тваім сябрам і таварышам, вялікая прыемнасць сёння павіншаваць цябе з днём слаўнага 50-годдзя.

Твой жыццёвы шлях да таго, як прыйсці ў літаратуру, праляг праз суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны. І як мужны воін Савецкай Арміі, як верны сын нашай Радзімы, як камуніст ты прайшоў цяжкія выпрабаванні вайны і доўгі час яшчэ пасля пераможных залпаў нашых гармат заставаўся ў войску, выхоўваючы маладое пакаленне савецкіх афіцэраў. Многія воіны, сённяшнія студэнты і таварышы ведаюць цябе як чулага настаўніка, педагога па прафесіі.

Побач з гэтай высакароднай якасцю тваёй грамадзянскай дзейнасці нашым шырокім чытачам ты яшчэ больш вядомы як паэт-перакладчык з англійскай, нямецкай, французскай і італьянскай моваў. Твая праца мае асаблівае значэнне ў сучаснай беларускай літаратуры таму, што ты — літаратар, які цалкам прысвяціў сваю работу перакладу з гэтых моваў і робіш яго па-майстэрску, з высокім густам, непасрэдна з арыгінала. Дзякуючы табе па-сапраўднаму вагучалі на беларускай мове В. Шэкспір, Д. Байран, Р. Бёрнс, Д. Кітс, Д. Радары. Твая праца плённа ўзбагачае нашу літаратуру і культуру.

Жадаем табе, дарагі Язэп Ігнатавіч, добрага здароўя, доўгіх год жыцця і новых творчых поспехаў».

Рэдакцыя «Літаратуры і мастацтва» далучаецца да гэтых шчырых слоў і жадае Язэпу Ігнатавічу, свайму актыўнаму аўтару, плёну ў рабоце і шчасця.

ДЗЕЛЯ ДУХОЎНАГА ЗБЛІЖЭННЯ НАРОДАЎ

Ніл ГІЛЕВІЧ

Геніяльны англічанін Шэкспір і яго не менш славуты зямляк—няўрымслівы рыцар свабоды Байран, народны паэт Шатландыі Роберт Бёрнс, вялікі амерыканец Уолт Уітмен, неўміручы немец Генрых Гейнэ, самабытны польскі рамантык Юліуш Славацкі, вясёлы і дасціпны італьянец Джані Радары, выдатныя сыны індыйскага народа Валатхол і Чытападхая—вось яны, усе перада мною, і гутараць са мною — кожны пра сябе і свой час, сваю краіну і свой народ. І слухаць мне іх надзвычай радасна, хораша і прыемна, бо гавораць яны са мною на мове маіх дзядоў і прадзедаў, прычым на мове такой багатай, прыгожай і чыстай, з такою павагаю да беларускага слова, ажно дзіўна робіцца, што яшчэ не так даўно гэтаму слову наогул адмаўлялі ў праве на існаванне.

Хто ж ён, той чарадзей, што прывёў да мяне ў госці і прымусіў загаварыць маёй роднаю мовай гэтых наймагутных волатаў сусветнай культуры і чалавечага духу? Каму я павінен сказаць ад усяго сэрца вялікае дзякуй за шчаслівую магчымасць пазнаёміцца і пагутарыць з імі ў сваёй роднай хаце, пагутарыць так інтымна і сардэчна, з такой узаемнай даверлівасцю і разуменнем, як толькі могуць гаварыць між сабою дзеці адной сям'і на мове сваёй маці?

Чарадзей гэты — наш добры і даўні знаёмы, вядомы беларускі паэт-перакладчык Язэп Семяжон. Аб ім і хочацца мне сказаць некалькі слоў з нагоды яго пяцідзесяцігоддзя.

Калі ў 1928 годзе чатырнаццацігадовы падлетак — сын Ігната Семяжона з вёскі Пятровічы Смалявіцкага раёна—трымаў у руках свежы нумар рэспубліканскай газеты «Беларуская вёска» і з хваляваннем перачытваў свой першы надрукаваны верш, наўрад ці ён мог падумаць тады, што лёс ягоны складзецца інакш, чым лёс яго паэтычных аднагодкаў, што ўласныя юнацкія вершы застануцца толькі дарагім успамінам. Але праз сем гадоў аб гэтым мог ужо задумацца студэнт факультэта замежных моў Мінскага педагагічнага інстытута, рамантычны юнак, закаханы ў жыццё і паэзію, поўны неадольнай прагі ведаў і жадання шырэй ахапіць душою і розумам незнаёмы і дзівосны свет. Бо іменна студэнт Язэп Семяжон, захапіўшыся цудоўнай паэзіяй Роберта Бёрнса (за гэта ён удзячны вядомаму шэкспіразнаўцу М. М. Марозаву, які ў той час чытаў у педінстытуце лекцыі па замежнай літаратуры), упершыню ў 1935 годзе пераклаў на беларускую мову некалькі вершаў вялікага шатландскага паэта. З той пары і да сённяшняга дня Бёрнс быў і застаецца найбольшай і нязменнай любоўю перакладчыка. А праз год у часопісе «Полымя рэвалюцыі» паявіліся пераклады Язэпа Семяжона з Байрана. Так пачаўся шлях маладога паэта ў вялікую літаратуру, шлях да вышынь майстэрства, да авалодання сакрэтамі нялёгкага перакладчыцкага «рамяства», да заслужанай вядомасці і папулярнасці буйнейшага беларускага паэта-перакладчыка.

Вайна перапыніла ўдала распачатую Семяжонам працу над перакладамі лепшых здабыткаў сусветнай паэзіі, на доўгія гады апрануўшы яго ў вайсковы шынель. Веданне замежных моў спатрэбілася на фронце. Але мара і жаданне вярнуцца да любімай працы не пагасла; наадварот, яна дыктавала яму лепш і глыбей засвойваць еўрапейскія мовы, рабіла іх вывучэнне мэтанакіраваным; з жыццёвым вопытам прыходзіла ўсведамленне свайго грамадзянскага і патрыятычнага абавязку — садзейнічаць развіццю і росквіту беларускай нацыянальнай культуры.

Пасля заканчэння вайны Язэп Семяжон доўгія гады працуе педагогам — выкладчыкам замежных моў (гэтай працы, уласна, ён не пакінуў і зараз), але ўсё больш і больш аддаецца другой, а правільней сказаць — першай сваёй любімай і пачэснай справе — перакладам. Апошняе дзесяцігоддзе было асабліва плённым у яго творчай паэтычнай дзейнасці. Менавіта ў гэты перыяд былі апублікаваны і атрымалі высокую ацэнку і прызнанне яго пераклады трагедыі Шэкспіра «Кароль Лір» (1954), зборніка вершаў Дж. Радары «Неапаль без сонца» (1955), зборніка вершаў Бёрнса «Шатландская слава» (1957), вершаў і паэм Байрана, Гейнэ, Славацкага, Уітмена, Дж. Кітса і многіх іншых сусветна-вядомых паэтаў.

Я не маю магчымасці ў невялікім газетным артыкуле зрабіць падрабязны разгляд хаця б некаторых перакладаў нашага юбіляра і мушу абмежавацца самай агульнай характарыстыкай іх мастацкіх вартасцей.

Я хацеў бы перш за ўсё падкрэсліць, што пераклады Язэпа Семяжона — гэта сапраўды **паэтычныя** пераклады, гэта плён вялікага душэўнага напружання, высокага творчага гарэння, работа душы і сэрца, а не халодная рамесніцкая штампоўка, якая, на жаль, яшчэ нярэдка рэкамендуецца чытачам пад выглядам мастацкіх перакладаў. Адзін мой балгарскі знаёмы гаварыў, што перакласці па-сапраўднаму мастацкі твор, перадаць нерастрачанымі яго вобразы, думкі і пачуцці, — гэта ўсё роўна, што перанесці ў прыгаршчах гарачае вуголле: маеш мужнасць і вытрымку — перанясеш і распаліш агонь у новым ачагу, а не маеш — дык толькі апячэшся. Высакародна, але пакутліва, пакутліва, але высакародна. У Язэпа Семяжона хапае мужнасці і вытрымкі, каб перанесці і распаліць у нас той агонь дум і пачуццяў, што бушаваў у сэрцах паэтаў розных эпох і народаў.

Пераклады Язэпа Семяжона, хаця і не ўсе яны — што само сабой зразумела — у аднолькавай меры дасканалыя і беззаганныя, — гэта, гаворачы словамі Маршака, «дзеці любві, а не шлюбу па разліку». Творы, што доўгія гады, а то і стагоддзі існавалі для нас недаступнымі ў сваёй першароднасці, праходзяць праз чарадзейную майстэрню паэта-перакладчыка і пачынаюць жыць другім жыццём — другім, але такім жа здаровым і паўнакроўным, як і раней, не растраціўшы ні свайго хараства, ні сілы. Наіўна думаць, што гэтае «другое нараджэнне» Байрана або Бёрнса не патрабуе ад перакладчыка, папершае, выдатнага паэтычнага дару, фантазіі і чуцця, а па-другое — поўнай самааддачы, ні на ёту не меншай, чым для ўласнай творчасці.

Менавіта ў паэтычным таленце Язэпа Семяжона, у тым, што ён — перш за ўсё паэт (хаця і не піша ўласных вершаў), паэт «міласцю божай», і трэба бачыць асноўную прычыну яго шматлікіх творчых поспехаў на ніве перакладчыцкай дзейнасці. І магчыма будзе дарэчы тут прыгадаць адну цікавую заўвагу вядомага рускага паэта і перакладчыка М. Забалоцкага: «Добры паэт можа быць дрэнным перакладчыкам. Прыкладам гэтаму Цютчаў. Добры паэт можа не мець схільнасці да перакладаў. Прыкладам гэтаму Блок. Але дрэнны паэт не можа быць добрым перакладчыкам».

На дапамогу таленту Язэпу Семяжону прыходзіць дасканалае або, ва ўсякім разе, някепскае веданне моў, з якіх ён перакладае. Мне асабіста гэтая акалічнасць здаецца надзвычай важнай, бо яна дазваляе глыбей зразумець змест арыгінала, паўней адчуць усе тайны і адценні ягонага сэнсу, улавіць яго музыку, інтанацыю, сінтаксіс. Без гэтага не можа быць сапраўды творчай і сур'ёзнай работы перакладчыка, а між тым якраз усё гэта і прападае для тых, хто практыкуецца (часам усё жыццё) перакладаць паэзію па так званых падрадкоўніках. Сёй-той, мабыць, каб апраўдаць уласную ляноту, сцвярджае, што зусім неабавязкова ведаць мову, з якой бярэшся перакладаць, і нават прыводзіць прыклады ўдалых перакладаў па падрадкоўніках. Такая пазіцыя ў цэлым абсалютна памылковая, а што да прыкладаў, то яны складаюць такія рэдкія выключэнні, аб якіх і гаварыць не варта.

Вельмі важным для паэта-перакладчыка з'яўляецца дасканалае веданне сваёй роднае мовы. Аўтарытэты сцвярджаюць — і з гэтым нельга не пагадзіцца, — што веданне сваёй мовы павінна быць больш грунтоўным, чым той, з якой робіцца пераклад. Што датычыць Язэпа Семяжона, то яго беларускай мове можна толькі пазайздросціць. Вось ужо дзе сапраўды мова — паслухмяны інструмент у руках паэта! Перакладчык надзвычай тонка адчувае слова, асабліва жывое, па-народнаму каларытнае і трапнае, умее яго падслухаць і выбраць з людской гаворкі або з невычэрпных крыніц фальклору, тоцка адчувае душу мовы — яе сінтаксіс і па-майстэрску карыстаецца ім для перадачы самых складаных эмацыянальных і вобразных паваротаў. Для пераканаўчасці я дазволю сабе прывесці толькі адзін прыклад — славуты верш Бёрнса «Фіндлей». Да Семяжона мы ведалі яго і паспелі палюбіць у перакладзе на рускую мову Самуіла Маршака, аднак паслухаем яшчэ раз, як ён гучыць па-беларуску:

— Хто гэта грукае ў акно?
«Хто ж, гэта я — Фіндлей!»
— Ідзі дамоў. Я сплю даўно!
«Не спіш!» — сказаў Фіндлей.
— Як ты асмеліўся будзіць?
«Ды так», — сказаў Фіндлей.
— Кату марцоваму карціць...
«Карціць!» — сказаў Фіндлей.
— Не адчыню — і не прасі...
«Прашу ж!» — сказаў Фіндлей.
— Да пеўняў спаць мне не дасі.
«Не дам!» — сказаў Фіндлей.
— Пусціць, а што калі радня?..
«Пусці!» — сказаў Фіндлей.
— Дык ты ж завалішся да дня.
«Да дня!» — сказаў Фіндлей.
— Такога толькі прыручы...
«Так-так!» — сказаў Фіндлей.
— Дык ты ж тут будзеш штоначы.
«І ўдзень!» — сказаў Фіндлей.
— Смала. Ну, што ж, дапамагу...
«Хутчэй!» — сказаў Фіндлей.
— Глядзі ж, нікому ні гу-гу!
«Угу!» — сказаў Фіндлей.

Зусім не для таго, каб параўноўваць талент і майстэрства двух перакладчыкаў, скажу, што мне асабіста «Фіндлей» Семяжона падабаецца больш, чым «Фіндлей» Маршака. Гэтак сама і некаторыя іншыя пераклады з Бёрнса, асабліва яго жартоўныя, гумарыстычныя вершы і песні. Тлумачыцца гэта, напэўна, тым, што мова Маршака занадта кніжная, літаратурна правільная для такога «не кніжнага», «не літаратурнага» паэта, як Бёрнс, у той час як сакавітая, яркая, часам грубаватая, не дыстыляваная мова Семяжона аказваецца ў выйгрышным становішчы. Я не ведаю, як гучыць «Фіндлей» у арыгінале, але па-беларуску ён гучыць так натуральна, ажно цяжка паверыць, што ён узнік не на беларускай зямлі. Здаецца, верш выдыхнуты адным дыханнем, на ім ніякіх слядоў працы, нічога неапраўданага і неабавязковага.

Творчыя перамогі Язэпа Семяжона абумоўлены несумненна і тым, што ў сваёй працы ён абапіраецца на традыцыі і дасягненні савецкай перакладчыцкай школы, на вопыт выдатных майстроў гэтага спецыфічнага роду літаратурнай дзейнасці ў Расіі. Беларускі аўтар Р. Бёрнса свядома кіруецца прынцыпам, згодна якога мастацкі пераклад не з'яўляецца калькай з арыгінала, «бяздушнай маскай з жывога аблічча» (яго ўласныя словы), але з'яўляецца натхнёнай творчасцю паэта, вынікам таленавітага творчага пераўвасаблення. Не слоўная, не парадкоўная — «фраза за фразай», «коска за коскай» — дакладнасць, а «паэтычная вольнасць без адвольнасці», вернасць духу арыгінала, а не літары, раскрыццё ідэйна-мастацкай сутнасці твора сродкамі роднай мовы і сваёй уласнай паэтычнай фантазіі, — вось тое галоўнае, што характарызуе творчы метад нашага перакладчыка. Дзякуючы гэтаму, пераклады Семяжона ўспрымаюцца заўсёды, як творы нашай беларускай паэзіі (не трацячы самабытнага аблічча арыгіналаў), яны становяцца фактам нашай нацыянальнай беларускай культуры, з'явай у нашым літаратурна-грамадскім жыцці. Я. Семяжон добра разумее, дзеля чаго ён працуе, ён свядомы творца, актыўны ўдзельнік адзінага непарыўнага працэсу — развіцця беларускай нацыянальнай культуры. У адным з артыкулаў ён пісаў: «Толькі таго перакладчыка, які не забывае сваёй адказнасці перад тым, каго ён перакладае, як і перад тым, для каго перакладае, чакае творчы поспех».

Паэтычныя пераклады Семяжона карыстаюцца вядомасцю і прызнаннем не толькі ў Беларусі, але і атрымалі высокую ацэнку на радзіме Бёрнса, на радзіме Славацкага, на радзіме Дж.Радары (у прыватнасці і з вуснаў самога паэта). Але перакладчык не жадае спыняцца на дасягнутым і тым часам рашыў пашырыць геаграфію сваіх перакладчыцкіх інтарэсаў. Ужо больш года ён працуе над перакладамі твораў нашых славянскіх братоў і суседзяў — сучасных чэшскіх і славацкіх паэтаў. Да ведама аматараў вершаваных падрадкоўнікаў, і гэтыя пераклады Язэп Семяжон робіць з мовы арыгіналаў. Паважаны ўзрост — не бар'ер у яго творчасці, у яго багатым і цікавым духоўным жыцці. Які павучальны прыклад для нашых маладых, ці не праўда?..

Калісьці М. Багдановіч, асвойваючы самыя складаныя жанравыя формы сусветнай паэзіі, меў на мэце даказаць, што беларуская мова такая ж прыдатная для гэтага, як і іншыя еўрапейскія мовы. Гэтая задача пасля Багдановіча паспяхова выконвалася многімі беларускімі савецкімі паэтамі, імёны якіх складаюць сёння нашу нацыянальную гордасць. З гэтай задачай выдатна спраўляецца і Язэп Семяжон, які ў сваіх перакладах даносіць да нас на роднай мове невымерна багаты і складаны свет дум і пачуццяў буйнейшых волатаў сусветнай чалавечай культуры.

Надзвычай важнай і патрэбнай уяўляецца мне праца таленавітага беларускага паэта-перакладчыка—праца, якая служыць вялікай і пачэснай справе духоўнага зблізжэння народаў, справе іх яднання ў барацьбе за шчасце людское, за набліжэнне таго часу, аб якім так горача марыў калісьці найлепшы сын шатландскага народа:

Павер жа, брат,
І ў толк вазьмі,
Што трэба жыць са славай,
Надыдзе дзень,
І між людзьмі
Братэрства стане явай...

Пажадаем жа нашаму юбіляру доўгіх год жыцця і добрага здароўя, пажадаем яму новых поспехаў і плёну.

ЭНТУЗІЯСТ ПЕСНІ

Зала клуба саўгаса «Рагазнянскі» перапоўнена. Затаіўшы дыханне, слухаюць рабочыя песні народаў Савецкага Саюза ў выкананні выкладчыка Кобрынскай музычнай школы С. Рыўкіна...

Амаль у кожнай вёсцы Кобрынскага раёна пабывала брыгада на чале з тав. Рыўкіным. Энтузіяст песні, ён выконвае для сельскіх працаўнікоў вакальныя творы беларускіх кампазітараў, чытае лекцыі па музыцы.

С. Рыўкін не толькі актыўны прапагандыст музычнага мастацтва. Яго ведаюць і як самадзейнага кампазітара — аўтара такіх песень, як «Лён», «Ой, пайду я выйду», «Прыляцелі ветры» на словы А. Русака, «Песня аб Кобрыне» на словы мясцовага журналіста Я. Ліфанава.

Каб лепш пазнаёміцца з характарам работы над песняй, спявак кансультаваўся ў народнай артысткі РСФСР І. Яунзем, заслужанай артысткі РСФСР І. Бастылбекавай, народнага артыста БССР Г. Цітовіча, кампазітара З. Кампанейца. Яны дапамаглі яму ў падрыхтоўцы разнастайнага рэпертуару.

Цяпер С. Рыўкін і заслужаны дзеяч культуры БССР М. Солапаў рыхтуюць лекцыю-канцэрт «Песні народаў СССР», з якой яны выступяць перад працоўнымі Брэста, Пінска і іншых гарадоў вобласці.

М. НЕМЦАВА.

□

Гродзенскі абласны драматычны тэатр паказаў прэм'еру спектакля «Простая рэч» па апавяданню пісьменніка Б. Лаўранёва.

Артыстка Л. Сторажава ў ролі падпольшчыцы Бэлы, заслужаны артыст БССР В. Грачынскі ў ролі Арлова.

Фота **П. Філіпава.**

Выйшлі з друку

А. Сабалеўскі. Уладар дум чалавечых. Творчасць народнага артыста СССР Барыса Платонава. Мастак А. Сапетка. Тыраж 2 500 экз., стар. 236. Цана 40 кап.

В. Вольскі. Родны край. На рускай мове. Для сярэдняга ўзросту. Прадмова Я. Маўра. Малюнкі В. Цімахановіча. Тыраж 50 тысяч экз., стар. 496. Цана 73 кап.

Г. Куноўскі. Сонечны агарод. Вершы. Для дашкольнага ўзросту. На рускай мове. Малюнкі М. Савіцкага. Тыраж 50 тысяч экз., стар. 24. Цана 20 кап.

Ул. Мехаў. Чырвоны губернатар. Аповесці і апавяданні. На рускай мове. Для сярэдняга ўзросту. Пераклад А. Цвярскога. Мастак Б. Забораў. Тыраж 50 тысяч экз., стар. 260. Цана 34 кап.

ЭСТЭТЫКА— ВЫТВОРЧАСЦЬ— БЫТ

ЧАЛАВЕК КУПЛЯЕ МЭБЛЮ

Чалавек зайшоў на выстаўку мэблі. Яго цікавіць, якія новыя ўзоры паказаны тут, наколькі ўдала і па-мастацку яны выраблены. І калі мэбля падабаецца наведвальніку, ён хоча бачыць яе не толькі на выстаўцы, а і ў магазіне, каб набыць для сябе.

На жаль, сучасныя камфартабельныя мадэлі мэблі яшчэ часам толькі бываюць «экспанатамі», і многія з іх наогул не трапляюць у гандлёвую сетку. Праўда, за апошні час у гэтай справе адбыўся пэўны зрух. Так, з мэтай цэнтралізацыі праектавання новых вырабаў, распрацоўкі неабходнай тэхнічнай дакументацыі ў рэспубліцы на базе былой мэблевай фабрыкі «Радзіма» створана эксперыментальна-канструктарскае бюро мэблі. З узорамі, якія паспела яно распрацаваць, пакупнік пазнаёміўся ўжо на нядаўняй рэспубліканскай выстаўцы-кірмашы. Яна праводзілася менавіта для таго, каб ацэнку мэблі далі не толькі розныя камісіі, гандлёвыя арганізацыі, а перш-наперш сам пакупнік. Бо нярэдка бывае ж і так, што новая мадэль таго ці іншага вырабу атрымала станоўчую адзнаку і зацверджана, а вось людзі купляць яе не хочуць—не падабаецца.

Вось чаму прыемна было чуць добрыя водгукі наведвальнікаў аб новых узорах мэблі, экспанаваных на выстаўцы. Многія з іх ужо стаяць у кватэрах савецкіх людзей, многія неўзабаве будуць запушчаны ў масавую вытворчасць.

Увогуле для непасрэднага кантакту з пакупніком, больш глыбокага вывучэння яго попыту ў мэблевым магазіне № 18 Мінска працуе пастаянная выстаўка мэблі. Сюды паступаюць пробныя партыі новых вырабаў. Нядаўна на выстаўку паступіла партыя секцыйных блокаў, спраектаваная і выраблена эксперыментальна- канструктарскім бюро мэблі. Пакупнік адразу заўважыў іх зручнасць і практычнасць, а таму вырабы хутка былі раскуплены.

Мала набыць добрую сучасную мэблю. Неабходна яшчэ ўмець яе размясціць у кватэры. А як гэта лепш зрабіць, можна паказаць у спецыяльна-абсталяваных боксах у магазіне-выстаўцы. Вось тут і ўзнікае пытанне аб культуры гандлю мэбляй.

На наш погляд, наспела неабходнасць далейшага ўдасканалення гандлю мэбляй шляхам спецыялізацыі. Напрыклад, у тым жа магазіне № 18 прадаваць камплекты для аднапакаёвых, двухпакаёвых і трохпакаёвых кватэр і пробныя партыі новых мадэлей. Другія магазіны маглі б прадаваць мяккую, кухонную, карпусную, секцыйную і іншую мэблю. Гэта дасць магчымасць пакупніку выбраць і добра агледзець той ці іншы выраб. У магазіне можна будзе абсталяваць невялікія інтэр'еры, каб наведвальнік больш ясна мог сабе ўявіць, як жа будзе тая ці іншая пакупка выглядаць у яго кватэры.

На жаль, пакупнік не заўсёды можа ўбачыць, выбраць тое, што яму патрэбна, бо пераважная большасць мэблі знаходзіцца ў складскіх памяшканнях. Нават у такім магазіне, як № 18 у Мінску, загрувашчаны ўсе куткі. Шмат набораў не распакавана. Яшчэ горш у іншых магазінах.

Чаму так атрымліваецца? Перш-наперш таму, што мэблевыя магазіны ў большасці непрыстасаваныя для гандлю, маюць невялікія памеры. Цесната стварае нязручнасці як для гандлёвых работнікаў, так і для пакупнікоў. Нават вынесці набытую рэч цяжка праз вузкія праходы.

І яшчэ пра адзін недахоп хочацца напомніць. Пры праектаванні сучасных мэблевых магазінаў забываюць пра істотную дэталь: плошча гандлёвых памяшканняў значна большая, чым складскіх. А трэба было праектаваць наадварот. Для мэблевага магазіна важна, каб плошча складскога памяшкання была большая, інакш сам магазін нарэшце ператвараецца ў склад. Памыліліся ў гэтым пытанні і пры праектаванні Дома мэблі, які будуецца ў Мінску.

Хочацца сказаць некалькі слоў і пра культуру прадаўца мэблевага магазіна. Ён не толькі павінен ветліва абыходзіцца з пакупніком, а добра ведаць сваю справу, тавар, якім гандлюе. На жаль, часта здараецца, што прадавец не ведае, як правільна адказаць пакупніку аб якасці новага вырабу. І калі ў гандлёвых школах рыхтуюць прадаўцоў прамысловых тавараў (абутнікоў, трыкатажнікаў і г. д.), дык зусім забыліся аб прадаўцах мэблі. Часта чалавек, які прадае мэблю, не ведае самых элементарных рэчаў, скажам, не можа адрозніць паліраваную апрацоўку ад лакіраванай. Таму ў гандлёвых школах неабходна спецыяльна рыхтаваць прадаўцоў мэблі.

Вось некалькі меркаванняў, якімі я хацеў падзяліцца. Яны, магчыма, і не зусім новыя, але гаварыць аб гэтым варта яшчэ і яшчэ. Бо тое, што ідзе ў быт савецкага чалавека, павінна быць зручным, дабраякасным, прыгожым.

Л. КАЙКОЎ,
начальнік аддзела тэхнічнай інфармацыі эксперыментальна-канструктарскага бюро мэблі.

Кніжныя навінкі

ЗБОРНІК А. КАРПЮКА

«Советский писатель» выдаў зборнік Аляксея Карпюка «На лясных сцежках». У кнігу ўвайшлі аповесці «Партызаны» («Пушчанская адысея»), «Дзяўчына з Ваўкавыска», апавяданні «Афіцыянтка», «Шафёр», «Наводчык Кунцэвіч», «Дзве сасны» і інш. Пераклады зрабілі Н. Кіслік, Я. Мазалькоў, М. Яромушкін.

Тыраж 30 тыс. экз., стар. 412. Цана 81 кап.



ЧАСОПІСЫ у лістападзе

ПОЛЫМЯ БЕЛАРУСЬ МАЛАДОСЦЬ

Неўзабаве выйдуць у свет лістападаўскія кніжкі часопісаў «Полымя», «Беларусь» і «Маладосць». Што ў іх новага, якія творы знойдзе на іх старонках чытач?

ПОЛЫМЯ. У нумары багата паэзіі. Надрукаваны вершы Аляксея Пысіна, Рыгора Няхая, Сяргея Дзяргая, Міхася Машары, Ніны Тарас, Еўдакіі Лось, Рыгора Семашкевіча. З прозы часопіс змяшчае апавяданні Алены Васілевіч і заканчэнне другой кнігі рамана Аркадзя Чарнышэвіча «Засценак Малінаўка».

У раздзеле крытыкі і літаратуразнаўства часопіс працягвае друкаваць даследаванне Рыгора Бярозкіна «Свет Купалы» і змяшчае нарыс Сцяпана Александровіча, прысвечаны жыццю і творчасці К. Чорнага. Бібліяграфія прадстаўлена рэцэнзіямі на «Выбраныя творы» Аркадзя Куляшова, раман-хроніку «Засценак Малінаўка» Аркадзя Чарнышэвіча (частка першая), кнігу нарысаў і публіцыстыкі «Сучаснік у грыме і без грыму» Георгія Коласа. Пісьменнік Янка Скрыган выступае з творчым партрэтам скульптара Заіра Азгура.

Да 50-годдзя Савецкай улады часопіс друкуе ўспаміны ўдзельніка грамадзянскай вайны Амляна Падуты. Аб паездцы беларускіх пісьменнікаў у Сібір расказвае ў нарысе «Ад Тувы да Талнаха» Павел Кавалёў. У нумары друкуецца таксама публікацыя М. Смолкіна «Рускі пераклад «Тараса на Парнасе» 1891 года» і іншыя матэрыялы.

«МАЛАДОСЦЬ». Тут аматары паэзіі знойдуць вершы Рыгора Барадуліна, Сяргея Дзяргая, нізку вершаў маладога паэта Анатоля Малюка, пераклады Язэпа Семяжона з эстонскай паэзіі.

У нумары друкуецца працяг аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» і апавяданне Міколы Лупсякова. 50-годдзю з дня нараджэння Язэпа Семяжона прысвячае свой артыкул Уладзімір Юрэвіч.

Пад рубрыкай «Кнігі і час» змешчан артыкул Барыса Бур'яна, у якім разглядаюцца новыя кнігі І. Бурсава, Ф. Яфімава і Ю. Лакербая.

У іншых раздзелах часопіса друкуюцца нататкі настаўніка В. Бечыка, дарожныя нататкі Віталія Вольскага, нарыс С. Кухарава і іншыя матэрыялы.

«БЕЛАРУСЬ». Часопіс друкуе апавяданні Міколы Ракітнага і Рыгора Няхая. Паэтычная рубрыка прадстаўлена вершамі Міколы Хведаровіча, Яраслава Пархуты, А. Шырылава, новымі перакладамі з чэшскай мовы Язэпа Семяжона.

Пра гісторыю і сённяшні дзень Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі расказвае Аляксандр Міронаў. Міхась Калачынскі прысвячае свае нататкі падарожжу беларускіх пісьменнікаў па дарогах Сібіры.

Знойдзе чытач у часопісе і іншыя разнастайныя матэрыялы.

На гэтай старонцы мы друкуем некаторыя з тых матэрыялаў, якія складаюць змест новых кніжак нашых літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных часопісаў.

Апошняя лістота. Фотаэцюд М. МІНКОВІЧА.

Рыгор БАРАДУЛІН

ЧАЛОМ ТАБЕ, ЕНІСЕЙ

У руках не калыша вятрэц
галышы,
Замёр.
Ліст не варушыцца...
Вадзіцель, матор заглушы.
Шушанснае...
Ціха...
Насцярожылася маўклівасць
пільная.

Ці гэта
Ільічова хаціна
ці ільменка,
якая толькі што слухала
енісеевай хвалі ўсхліп
і цяпер пад зялёнай паветкай
ліп
сушыцца?
Не адказвае
Шушанснае...
Першы пажоўклы ліст
ліпа на ганак стрэсла...
Чакаюць, падагнуўшы калені,
краслы.

Адпачывае лямпа,
Крупскай прывезеная...
Немаўлячы мезенец
на столі настылай сібірскіх
снягоў
мог бы засланіць трапятную
плямку
ад гэтай лямпы.
Святло было
мірным зусім.
І ў падумку не браў, што на ім
падсмаліць
сваё, даўно не густое, пер'е
двухбезгаловы арол імперыі...
Як ціхі прыстанак,
спакушае спакоем
альтанка
з хмелю ляснога
дзікага.
Гадзіннік цікае...
Хвіліны апошнія
лічыў ён свету старому.
На стале —
Ільічова пошта...
На «ясна» барометр...
А ён навальніцу паказваў,
калі апускаў Енісей
свае плечы пакатыя.
І снегавыя падушкі для Енісея
азяблымі пальцамі ўзбівалі
завеі.
А ў галавах ледзяной пасцелі
стаць разам усе маразы
хацелі...

Енісей,
на ўспамін
лёгкі ты:
уздыхнуў —
і лісты
дзікага хмелю
зашапталіся, зашумелі...
Здымаю ўдзяні шалом
перад табою з пашанай —
Чалом
табе, Енісею,
чалом,
што ты Ільіча адведаць
спяшаўся,
ды выбегла
шустрая Шуш
насустрач.
Чалом
за твой крыгалом,
які Ільіча на дасвецці будзіў
і доўга па сцежках таежных
рэха вадзіў.
Чалом,
што ты ахінаў Ільічовы думы
выраевым крылом.
Чайкі ўзляталі з твайго пляча.
З далёкага выраю
ты клікаў выраем
Ільіча.
Чалом,
што на табе веславала паволі,
як колісь па Волзе,
Вясёлкі вясёлым вяслом
Надзея.
Чалом,
Енісею!..

Малюнак В. Шрамякова да нататкаў В. Бечыка «Клас восьмы, клас дзявяты...».

Міхась МАШАРА

*

Песні, песні — крылатыя птахі,
колькі вас наспявалі гады!
Я за вамі па сонечным шляху
век імкнуся, заўжды малады.

Мне знаёмы і горы і долы,
вашых сцежак балючы залом.
Многа знаю вас—сумна-вясёлых,
многа знаю вас — гучных, як гром.

Вы не гусі... Навошта вам вырай?
Хоць жыццё ваша — вечны палёт.
Вы з пачуццяў гарачых і шчырых,
што з душы выкрасае народ.

На прапісцы ў людзей вы адвеку,
назаўжды палюбілі свой кут.
Песні, з вамі лягчэй чалавеку
І ў цяжкія часіны пакут.

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ

*

Сад вартую. Палку далі мне.
Павіншуйце, людзі,
з наваселлем.
У маім прасторным будане
Смачна пахне яблыкамі, сенам.

Цішыня у садзе шмат начэй...
Мо чакае хто гадзіны лепшай?
І сабака мой зусім здзічэў —
Як на зоры, на ранеты брэша.

Спяць дарогі, вербы ля ракі.
Я не сплю. І ціхі сум і змора.
Хай бы ў сад залезлі хлапчукі,
Абтраслі і яблыкі і зоры.

Хай бы кожны тут мурог
таптаў,
Страх свой пасылаючы да
д'ябла.
Я ж бы і сабаку патрымаў —
Свету не шкада ім, што там
яблык!

Мо з галля хто пляснуўся б
далоў —
І шумлівым гуртам уцякалі б,
І з усіх сабак, вартаўнікоў
На усё ваколле рагаталі.

Анатоль МАЛЮК

ПЕРШЫ СНЕГ

Першы снег з сыраежкавым
пахам
Апусціўся ціхутка на дол.
У вялікіх пуховых папахах
Стрэхі хат прыцярушаных сёл.
Першы след аддрукоўвае ліска,
Петлянуў хітравата бяляк.
Над зямлёй перакулены нізка
Неба зімняга шэры каўпак.
Быццам з казак з'явіліся дрэвы:
Дуб, як белы агромністы грыб,
Як жывыя стаяць каралевы,
У прысадах бярозкі між ліп.
У палях зноў гуляюць мяцелі,
Свае песні спяваюць без слоў.
Пірамідкамі елкі паселі.
За спіной пацыселых лясоў.
Першы снег—залатая пароша,
Харасто беларускай зямлі,
Далягляд такі светлы, харошы,
Што душой маладзеем і мы...

Рыгор НЯХАЙ

У МУЗЕІ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Строгія светлыя залі
Я не забуду ніколі.
Сурмы над краем зайгралі
Гэтак трывожна аб волі.
Зноў узлятае Гастэла,
Мчацца Даватара коні.
Тысячы дужых і смелых
Мы ўспамінаем сягоння.
Сын выпраўляецца з хаты;
Сцежкі задымлены ў полі;
Дзеўчына лашчыць гранаты,
Думае ў лесе аб волі.
Гэта мая трывога
Грукала навальніцай.
Гэта й мая дарога...
Як часта яна мне сніцца!

Сяргей ДЗЯРГАЙ

НА БЫЛЫМ МІНСКІМ НАПРАМКУ

На дачу прыехалі сёлета
з сынам мы.
Ходзім у лес штоpанак.
І ён мне: «Вось тут, за лясамі
за сінімі,
Мінскі і быў напрамак?»
Мы колісь у гэтых лясах
партызанілі —
Сцежкі усе знаёмы:
Там сябра забілі... мяне тут
паранілі...
Далей — «аэрадромы».
«Фашысты на вас тут ішлі, кажаш,
хмараю?
Я тады дзе быў, тата?»
«Ты быў, мой маленькі, вялікаю
мараю,
Сённяшняй явай, святам».
Гаворыць а дзіцячаю логікай
простаю —
Ёсць яна у малечы:
На сцежачцы пень «недарэчы
выростае».
Згодзен з ім — недарэчы.
Ідзём—і малое пытае, выпытвае...
Раптам глядзіць, дзіцёнак:
Праз каску іржавую, куляй
прабітую,
Буйна прарос рамонак.
Салдацкая, нашая каска
салдацкая,
Збоку рамень сатлелы.
І кветка — дзівоснай разбярскаю
цацкаю —
Родны рамонак белы.
Паўжменькі зямелькі, і дожджык,
і сонейка,
Кветцы—сушыся-мокні!
Малы мой пытае: «Возьмем
рамонак, а?
Кветкам жа месца — на вокнах!»
У вочы глядзіць мне з чаканнем
і ласкаю:
«Возьмем,—кажу, — вядома».
І кветку з іржавай салдацкаю
каскаю
Мы з ім нясём дадому.

Збіраючы матэрыялы пра Кузьму Чорнага — чалавека вялікага сэрца, пісьменніка яркага і вельмі самабытнага таленту, я запісаў успаміны яго сясцёр М. К. Раманоўскай і Г. К. Высоцкай, жонкі — Р. І. Свераноўскай, настаўніка В. П. Сенюка, які вучыўся з будучым празаікам у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, а таксама яго землякоў-цімкаўцаў. У гэтых успамінах ёсць многа новых звестак пра дзіцячыя гады і юнацтва Чорнага, яго сям'ю, вучобу ў Нясвіжы, ёсць шмат цікавага адносна гісторыі напісання некаторых твораў і правобразаў іх герояў. Таму, апрацоўваючы ўспаміны, асноўную ўвагу я ўдзяляў новым фактам і такім бытавым дэталям, якія дапаўняюць наша ўяўленне пра жыццё і сям'ю Кузьмы Чорнага.

АУТАР.

СЭРЦА, У ЯКІМ МЕСЦІЦЦА ЦЭЛЫ СВЕТ

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ

Пакуль семінарыя была закрыта, Мікалай Раманоўскі разам з бацькам цяслярыў, рабіў сталярку. Але ў тыя ваенныя гады мала хто будаваўся. Таму заработкі былі слабыя, елі больш бульбу з расолам. За ўвесь год пяклі толькі адзін-два разы свой хлеб, а то жылі на бульбе, праснаках і блінцах.

Калі белапалякаў прагнала Чырвоная Армія, Мікола зноў падаўся ў Нясвіжскую семінарыю. Але правучыўся нядоўга. Позняй восенню 1920 года наказалі з дому, што захварэла маці. Прыйшлося вярнуцца ў Цімкавічы, а неўзабаве пайшла чутка: Нясвіж астаецца на тым баку, у палякаў.

Маці хварэла даўно. Яна часта гаварыла:

— Мяне згубіла тая абора лапаціцкая. Пакуль падоіш кароў зімою, дык закарчанеюць рукі і ногі, а спіны не разагнуць — адтуль прывезла сухоты. Даліся ў знакі мне тыя Боркі і Лапацічы...

Цяпер маці зусім занемагла. Яна неяк адразу асунулася з твару, пастарэла, але ні аднаго слова скаргі ад яе ніхто не чуў. Калі прыходзілі ў отведы суседкі, Гліцэра Міхайлаўна па-ранейшаму жартавала, спрабавала нават зацягнуць песню.

Адведаць слаўную сурвэтніцу прыходзілі многія цімкаўскія кабеты. Заглянула ў хату нават і Гэлька Касікоўская, пастаяла ў парозе, а потым прыслала шклянку мёду.

Зімою з 1920 на 1921 год было вельмі цяжка з лекамі, іх нельга было нідзе знайсці нават за вялікія грошы. Мікола хадзіў у Капыль, Слуцак, прасілі балаголаў, каб прывезлі з Мінска, але і там не было. Тады нехта параіў схадзіць у Нясвіж, там нібыта можна дастаць усялякія лекі.

У паход за граніцу (якое непрывычнае і дзіўнае гэта было слова для цімкаўцаў: падумаць толькі — Нясвіж за граніцай!) пачаў збірацца Мікалай. Думалася, ён там дастане такое лякарства, што хваробу як рукой здыме, і маці ўстане з ложка. Было вядома, што мяжа яшчэ не ўсталявалася і пагранічнікі стаяць толькі на Варшаўскай шашы ў Піліпавічах, недзе каля Браткава ды ў лесе за Вялікай Раёўкай.

Дарогу на Нясвіж Мікола ведаў добра: за тры гады вучобы ў семінарыі ён тут папахадзіў і папаездзіў. Выбраўся ён так, каб да цямна трапіць у Кукавічы. Карчмар Шлёма Бакуноў завёў начаваць у стадолу, далей ад людскога вока. Назаўтра яшчэ на цямочку Раманоўскі мінуў хвойнік, які цяпер лічыўся «граніцай», і прыйшоў у Нясвіж.

Там ён сёе-тое купіў з лекаў, апошні раз прайшоў ля двухпавярховай мураванкі з чырвонай цэглы, на якой красавалася шыльда: «Несвижская учительская семинария». Ідучы назад, Мікола сустрэў насупраць хаты арандатара Навума Харлаба знаёмага семінарыста, але той, на шчасце, яго не заўважыў. Хацеў яшчэ зайсці на Загуменную вуліцу, дзе ён два гады жыў на кватэры ў Раўтовічаў, але перадумаў...

Лекі не памаглі. Маці збіралася ў апошнюю дарогу і папрасіла звязаць на смерць шарсцяныя панчохі. Памерла Гліцэра Міхайлаўна ў суботу перад тройцай. Было гэта ў 1921 годзе.

Мікола тады працаваў у Цімкавіцкім валасным рэўкоме. Пасля ён служыў у Слуцку, потым вярнуўся ў Цімкавічы, настаўнічаў у школе. Заработную плату ў школе плацілі жытам. Гэтым жытам засеяў Каролек зямлю, якую дала яму і яго сям'і Савецкая ўлада.

Працуючы ў школе, Мікола многа чытае, спрабуе свае сілы ў літаратуры, піша вершы і апавяданні. У маі 1923 года газета «Савецкая Беларусь» друкуе першае апавяданне «На граніцы». Калі Сэліны дзяўчаты расказалі Каролеку, што сын яго друкуецца ў газетах, бацька не паверыў. А потым ніяк не мог зразумець, чаму Мікола падпісваецца не сваім імем, а прыдумаў нейкага Кузьму Чорнага.

Многія цімкаўцы ехалі вучыцца — хто ў Слуцак, хто ў Мінск. Не мог уседзець дома і настаўнік Раманоўскі. Летам 1923 года ён пехатою сходзіў у Мінск. Сказаў бацьку, што пойдзе ў Слуцак, а там паедзе з балаголам, але туды і назад дабіраўся пешкі. Гэта была разведка, ці прымуць ва універсітэт з трыма курсамі семінарыі.

Пасля Кузьма Чорны вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта універсітэта, супрацоўнічаў у перыядычным друку і многа-многа пісаў.

Жыў малады пісьменнік на прыватнай кватэры у старога чыгуначніка Мухамора на Койданаўскай вуліцы. Стыпендыі не атрымліваў, сяк-так трымаўся на мізэрным літаратурным заробку. Памагалі крыху з дому, з цімкаўскімі балаголамі бацька прысылаў сухароў, а часам і кусок сала. Калі было зусім крута, хадзіў са студэнтамі ноччу разгружаць ці нагружаць вагоны на таварную станцыю.

За кватэру Чорны плаціў мукою: у месяц пуд мукі. Такая тады была кватэрная плата ў Мінску.

Улетку ён прыязджаў у родныя Цімкавічы, прывозіў сёстрам і братам гасцінцы з горада. Прывозіў дамоў і рукапісы твораў, якія не пайшлі ў друк ці сам патрабавальны аўтар іх не пусціў у людзі. Рукапісы Кузьмы Чорнага траплялі адлежвацца ў куфэрак, што служыў колісь семінарысту Мікалаю Раманоўскаму за чамадан. Шкада, што гэты запаветны куфэрак згарэў у 1933 годзе, калі вялікі пажар на Капыльскай вуліцы вымеў паўмястэчка.

Калі Кузьма Чорны садзіўся за пісьмовы стол, яго абступалі блізкія суседзі-цімкаўцы і проста знаёмыя людзі, з якімі ён сустракаўся ў часе вандровак па Случчыне. З імі Кузьма Чорны шчыра, па-сяброўску размаўляў, заядла спрачаўся, радаваўся за іх, жыў іхнімі пачуццямі, думкамі і роздумам. Знаёмыя цімкаўцы не прасіліся ў яго творы, а неяк самі асталёўваліся там, гаварылі пра сябе, выказвалі свае думкі ўголас, нібыта сядзяць яны на Уладзевай прызбе ці ў Клемансавай хаце.

Усё найбольш значныя творы Чорнага — і апавяданні, і аповесці, і раманы — і раннія, і напісаныя перад і ў часе вайны, цесна звязаны з той мясцінай, дзе «паблізу чутны ў людской гаворцы гарады Нясвіж і Слуцак», інакш кажучы, звязаны з Цімкавічамі, а героямі іх з'яўляюцца землякі пісьменніка. «Мне б на ўсё жыццё хапіла апісваць цімкаўцаў»,— часта гаварыў Кузьма Чорны.

Вось ранняе апавяданне «Восень і радасць». Гэта словы пра маці, яе вялікае сэрца, замілаванасць да прыроды і жыцця.

У аснову твора, жанравыя асаблівасці якога вызначаны аўтарам — «настроі», пакладзеныя, як сведчаць сёстры Чорнага, рэальны факт. Брат пісьменніка Міхась сеяў жыта і прынёс дамоў падбітую птушачку. Гліцэра Міхайлаўна тады цяжка хварэла і не ўставала з пасцелі. «Тры дні спявалі вятры глыбокія песні, і тры дні ў хаце на асвечаным асеннім сонцам акне крычала пакутніца-птушка». Гліцэра Міхайлаўна пазірала на пакуты раненай птушкі і плакала: «Слёзы маткі — сілу ж іх хто выявіць?! Наша маці гэта была. І тады мне зрабілася ясна: гэта ж плача яна не над птушкай. Гэта ж бунт вялікі паднялі ў ёй пачуцці».

Многа з асабістага, навеянага ўражаннямі лета 1923 года захавалася ў апавяданні «Хвоі гавораць». Тут ёсць нават рэальныя факты: «Мае справы такія: канчаю разам з бацькам на полі ворыва, малачу і чакаю з горада паведамлення — **ці залічаны я студэнтам**». Твор пісаўся ў 1926 годзе, праз тры гады пасля таго памятнага лета: **«Тры гады** — вялікі час у чалавечым веку. Я цяпер успамінаю, адчуваю і думаю». У апавяданні надта характэрная канцоўка. «Родныя мае! Блізкія мае!» — гаворыць аўтар пра герояў апавядання.

Лірычны герой апавядання «Хвоі гавораць» — сам Мікалай, дзядзька Язэп — далёкі сваяк, цімкавец Адамовіч, у якога сапраўды быў сын Міхал, дзяўчына Дося — гэта Вікця, толькі ў жыцці была яна дачкой не Адамовіча, а Андруковіча — суседа Раманоўскіх. Трымаецца пісьменнік нават і другарадных дэталей: былі ў Цімкавічах і Пятрусь Міхалінчык, і Яўхім Стрыгун, і стары Гірш, а ў доме папа Жалезняковіча сапраўды гаспадарылі камсамольцы.

«Трагедыя майго настаўніка» (зборнік «Вераснёвыя ночы») — гісторыя трагічнага лёсу настаўніка Ляхоўскага — таго самага, што рыхтаваў Кузьму Чорнага і яго сяброў да паступлення ў Нясвіжскую семінарыю. Толькі пісем настаўнік свайму вучню не пісаў, гэта творчы прыём, які дазволіў пісьменніку расказаць сумную гісторыю жыцця любімага настаўніка, якога загрызлі сын і нявестка.

Апавяданне «Вераснёвыя ночы» пачынаецца малюнкам студні Юрася Касікоўскага, з якой Раманоўскія бралі ваду. Але аўтарская задума вырасла са здарэння, што адбылося ў Чарнагубаве — суседняй з Цімкавічамі вёсцы.

Калі з'явіўся апавяданне «Брыгадзірава памылка», то, паводле сведчання сястры пісьменніка — Г. К. Высоцкай, усе цімкаўцы пазналі брыгадзіра Кастуся Кастэцкага і яго жонку Лізавету. Сваіх прататыпаў мелі Тоня Базылькевіч і Насця («Мураваны скляпок»). Гэта гісторыя сватаўства Паўла Яроцкага да Матыні з Калодзезнага, якой Кузьма Чорны надаў толькі шчаслівую канцоўку. Многа жывых уражанняў і фактаў ёсць таксама ў апавяданнях «Дзякуй богу, як шклянка», «Па дарозе», «Рамонтная брыгада» і іншых творах.

Вядома, пісьменнік ніколі не пераносіў жыццём у апавяданні бачанае, у сырым выглядзе; у яго жыццёвы матэрыял заўсёды праходзіў адпаведную творчую апрацоўку і набываў новыя якасці, станавіўся арганічным сплавам рэальнасці і мастацкага домыслу. Назіральнае вока выдатнага беларускага празаіка ўмела адбіраць з незвычайнага багацця фактаў самае характэрнае, самае істотнае і вызначальнае, такія яркія дэталі, што многія героі, з жывымі прататыпамі якіх Чорны сустракаўся, набывалі новыя рысы, станавіліся тыпізаванымі вобразамі.

Таму Леапольд Гушка — у нейкай меры боркаўскі парабак сілезец Леапольд Ешка і адначасова зусім іншы чалавек па сваім характары і парываннях. Максім Астаповіч — гэта цясляр Каролек Раманоўскі і ў той жа час тыповы вобраз чалавека, для якога праца — паэтычнае натхненне, жыццёвая неабходнасць. У Кастуся Прыбыткоўскага многа агульнага з жыццёвым лёсам малодшага брата Кузьмы Чорнага Юрася, які перад самай вайной ажаніўся, служыў у арміі ў Рыльску, у першыя дні вайны трапіў на фронт і быў паранены. Аднак сцвярджаць, што Кастусь Прыбыткоўскі — гэта толькі Юрась Раманоўскі, нельга, бо пісьменнік у аповесці «Скіп'еўскі лес» ставіў значна шырэйшую і глыбейшую задачу, чым звычайны паказ франтавых дарог брата.

Назіранні і ўражанні, рэальныя факты і падзеі так узбагачаліся і напаўняліся пісьменнікам — выдатным знаўцам чалавечай душы, а рысы многіх прататыпаў так пераўтвараліся і зліваліся ў адзінае цэлае, што станавіліся пад пяром мастака глыбокім роздумам над жыццём, лёсам народа і краіны. У гэтым сэнсе вельмі цікавая перадгісторыя падзей, з якіх выраслі два раманы Кузьмы Чорнага — «Трэцяе пакаленне» і «Вялікі дзень».

Сястра Каролека Раманоўскага Марыля служыла ў кудзінаўскім маёнтку панаёўкай, а потым ахмістрыняй. Была яна зборлівая і зайздрослівая, як яе бацька Фэлька. За час службы ў Яблонскіх яна сабрала многа панскіх трантаў-неданоскаў і мела грошы, каб купіць дзесяцін пяць зямлі. Марыля даўно аціралася ля пані і сябе лічыла таксама без малага паняй. Выйшла яна замуж за кудзінаўца Рыгора Сухавея, які быў у пана Яблонскага аканомам. Пасля яны жылі ў Міроўшчыне, наймалі парабкаў. Рыгор Сухавей, па мянушцы Бакач, стаў раптам панам Гжэгажам: купіў гадзіннік з ланцужком, апранаў панскую камізэльку, улетку хадзіў у наваксаваных ботах. Сваіх дзяцей Сухавеі паслалі вучыцца ў Нясвіж: Ваця і Ярош вучыліся ў мужчынскай гімназіі,

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Мікола РАКІТНЫ

ЯВАР

АПАВЯДАННЕ

У Пятроўцы за мостам, дзе першы пасяліўся Мітрафан Лугавы, здаецца, нядаўна яшчэ ляжала пустка. З аднаго боку ад шляху на ёй вечна таўклася розная вясковая хатняя жыўнасць, а з другога — слаўся брудны, чарналісты, знітаваны каровінымі сцежкамі нізкарослы алешнік.

Прайшлі гады, і выстраіўся тут рад новых гонтавых дахаў, знікла пустка пад навіссю садоў. А там, дзе чарнеў закарузлы алешнік, разлілася сажалка, увабраўшы ў сябе ўсю ясную сінь летняга неба.

Абнавіўся кавалачак зямлі. А на шляху, дзе па-ранейшаму гуляў вецер і кружыў віхуры пяску, было гола і няўтульна.

І нібы ўспомніў Мітрафан пра той мудры нагадак— пасадзі, чалавек, дрэва!—прывёз з берагу Дняпра маладзенькі копанец явара. Доўга яму выбіраў месца: каб калі вырасце, адусюль быў відзён. І пасадзіў яго ля моста на шляху, на разбегу дарог.

Вясной дрэўца пусціла першыя зялёныя пятачкі глянцавітага лісця, і ўзрадаваўся Мітрафан: перасяленец прыняўся. Але шмат яму было суджана вытрымаць нягод, каб узняцца ад зямлі, набрацца дужасці — стаць сапраўдным дрэвам. Лісце яго абсыпала пяском, да кволага голля цягнуліся пысы кароў, і тонкі стволік часта гайдаўся ад жорсткіх бакоў лычатага племя. Крычаў, галёкаў Мітрафан, адганяючы ад саджанца гэту навалу, і зрабіў, што мог,—абхутаў ствол аполкамі і абматаў іх калючым дротам.

Многа вёснаў і зім прастаяла дрэва. Ужо высока ўзняло і раскінула пышную крону, а ствол яго, набраўшыся сілы, так распёр старыя аполкі, што ў іх глыбока ўпілося калючае драцінне. Хацеў Мітрафан ужо расхутаць яго, даць яму волю, але здарылася зусім непрадбачанае.

Калгасныя манцёры павялі ў сяло электралінію — укапалі слупы, ды так, што правады яе якраз ляглі на макаўку явара. Бедаваў, моцна лаяўся Мітрафан і на манцёраў і на сябе, што праваронію, не дагледзеў, як ставілі тыя слупы. І скончылася, урэшце, тым, што лінія засталася, а дрэва трэба было перасаджваць.

Усёй вёскай ратавалі явар. Пасадзілі яго бліжэй да сажалкі — і сёння не скажаш, што за кароткае сваё жыццё яму тройчы давялося пускаць карэнне ў зямлю-матухну.

Ён ужо высокі, дужы і шырокі сваім багатым голлем. І Мітрафан цяпер глядзіць на яго, як бацька на сына, які ўжо выйшаў на сваю дарогу.

У ясную пагоду ён ледзь варушыцца, ледзь-ледзь чуецца яго ласкавы і меладычны шэпт. А калі над сажалкай устане цёмная хмара, — уздыбіцца, загамоніць і ўвесь засерабрыцца падсподам адзення. І тады з-за ўлынарнай сасны злятаюць і пускаюцца ўлёт маладыя буслы. Многа вакол дрэў, утульных і высокіх, а яны, буслы, доўга кружаць адзін за адным, над маладым яварам, углядаюцца ў яго срабрыстую макаўку і як бы паказваюць сваёй вышынёй, декуль яму трэба ўзняцца.

Малюнак А. Кашкурэвіча да апавядання Ш. О'Фаалайна «Грэшніца».

Мікола ХВЕДАРОВІЧ

СОЛЬ ЗЯМЛІ

I

Над Старобінам,
Ціхім мястэчкам,
На радзіме маіх землякоў
У балотнай тузе спрадвечнай
Адплылі караваны вякоў.
Ён не венчаны гордаю славай,
Ён са славаю не дружыў,
І адзначаным гербам дзяржаўным
Наш Старобін ніколі не быў.
Знемашчалыя нівы прасілі
Скарбаў тых, што ў глыбінях
ляжаць.
Ды марнелі, патраціўшы сілы,
Іх сушыла балотаў іржа.
А вятры сівагрывыя гналі
На палеткі сухія пясні,
І стыхіі зямлю руйнавалі
Не гады, а—стагоддзі-вякі.
Век далёкі скупы быў на словы,
Гэтых слоў мы не чулі здаля.
І былі неадшуканы сховы,
Што для нас прыпасала зямля.

II

У Старобіне, ціхім раёне,
На радзіме маіх землякоў,
Новы горад збудованы сёння,
Загарэліся зоркі капроў.
Камяніцы—не курныя хаты,
Зяе бляск электрычных зор.
Тут працуе ў глыбокіх шахтах
Наш зямлян—беларускі шахцёр.
Не кайло і не лом пудовы
Ён трымае цяпер у руках,
Паслухмяным камбайнам новым
Пад зямлю ён пракладвае шлях.
Не спыняюцца сэрцы матораў,
Хоць парода цвярдзей за граніт.
І нясуць, і нясуць транспарцёры
Соль зямлі—дарагі сільвініт.
Не паверылі б цуду ніколі
Са Старобіна, Слуцка дзяды,
Што свае у іх солі—даволі,
Хопіць ім для жыцця назаўжды.
Кожны туліць у сэрцы веру,
Што зямля іх—пясчанік, падзол—
Сільвінітам пасоліцца ў меру
І забудзе пра свой недасол.
Сустракайце ж багатую восень,
Каб засекі ў вас поўны былі.
Хай шуміць ураджаем калоссе,
Адчуваючы сілу зямлі!

ЛІТОЎСКІ САЛАВЕЙ

Сёння спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння выдатнай літоўскай паэтэсы Саламеі Нерыс.

Саламея Бачынскайтэ-Бучэнэ нарадзілася ў сялянскай сям'і ў паўднёвай Літве. Пасля заканчэння сярэдняй школы яна паступае ў Каўнаскі універсітэт, які і заканчвае ў 1928 г. Да 1940 г Нерыс працавала ў гімназіі выкладчыцай літаратуры ў Лаздзіяй, Паневежысе і Каўнасе. Вершы яна пачала пісаць яшчэ ў школьным узросце і выбрала сабе псеўданім — Нерыс — па назве ракі, што працякае праз старажытную літоўскую сталіцу.

Ад інтымнай лірыкі, ад вершаў, у якіх не было сацыяльных праблем, паэтэса неўзабаве пераходзіць да твораў шырокага грамадзянскага гучання, далучаецца да вялікай групы рэвалюцыйна настроеных літоўскіх пісьменнікаў. У 1931 годзе ў 5 кніжцы часопіса «Трэці фронт», рэдактарам якога быў А. Венцлова, Саламея Нерыс смела выступае супраць буржуазных літаратурных плыней у тагачаснай Літве: «Ад гэтага часу я свядома выступаю супраць эксплуататараў рабочага класа і пастараюся сваю працу спалучаць з дзеяннямі абяздоленых мас так, каб мая паэзія ў будучым выказвала іх спадзяванні і ідэалы народнай барацьбы і была б у гэтай барацьбе іх зброяй».

У 1940 годзе С. Нерыс з вялікай радасцю вітае далучэнне Літвы да Савецкага Саюза. Народ выбірае паэтэсу ў дэлегацыю Народнага сейма Літвы на сесію Вярхоўнага Савета СССР.

У 1941 г. Саламея Нерыс была выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны паэтэса актыўна працуе як літаратар і грамадскі дзеяч. Яна часта выступае па радыё, выязджае на фронт, дзе чытае свае палымяныя вершы воінам Савецкай Арміі. Многія яе творы былі прысвечаны адважным літоўскім партызанам. Сярод гэтых твораў асабліва вядома паэма «Марыя Мельнікайтэ».

С. Нерыс з'яўляецца аўтарам выдатных кніг паэзіі: «Апявай, сэрца, жыццё!», «Мой край», «Салавей не можа не спяваць», у якіх з вялікай сілай гучыць голас паэта-грамадзяніна, савецкага патрыёта. Цудоўныя творы, паэмы-казкі падарыла яна і юным чытачам: «Падарунак Лаўмэ», «Сіротка», «Эгле, каралева вужоў».

На вялікі жаль, паэтэсе не давялося ўбачыць росквіту пасляваеннай Савецкай Літвы. Нерыс памёрла ў 1945 годзе.

Выдатныя вершы літоўскай савецкай паэтэсы жывуць бессмяротным жыццём, яны перакладаюцца на многія мовы і знаходзяць жывы водгук у сэрцах людзей.

Саламея НЕРЫС

З КНІГІ «МОЙ КРАЙ»

МАРЫТЭ

Асенні ліст ляціць з асіны —
Чырвона на зямлі.
Айчыну бараніць мужчыны
Усе, як адзін, пайшлі.

Дзяўчынка застанецца дома,
Калі браты ў баях?
Не! Ты дарогай незнаёмай
Пайшла па іх слядах.

Цяпер ні голад, ні марозы
Не страшныя малой.
І моўчкі ты глытаеш слёзы
І строгі позірк твой.

Цяпер не скажуць, што нібыта
Дурэе ўсё яна.
Няма ранейшае Марытэ,
Калі ідзе вайна!

Не глянеш у люстэрка тое,
Ці добра ў шынялі?
Ты раненых выносіш з бою —
Хай страшна на зямлі!

За родны край ідзе расплата!
Адважна, як салдат,
Марытэ помсціла за брата,
Калі загінуў брат.

1942 г.

ШТО СКАЗАЛА МАЦІ

Зорны лівень падае ў лагчыны,
Тонкі лёд на лужынах блішчыць.
Сцежкай непракладзенай жанчына,
Згробленая цягнецца, маўчыць.

Цяжка ёй. Пакутуе старая.
Дзе сынок? Лістоў з вайны няма...
Круглы год яна ідзе, шукае
І знаходзіць роднага сама.

Згаслыя яна пазнала вочы,
Рысы добрай, юнай пекнаты.
«За Радзіму ў бой устань,
сыночак!
Хто яе ўратуе, як не ты?»

«Мама!
Хай лютуе чорны вецер,
Абмываюць ліўні галаву!
Я памёр,
жыве любоў на свеце,
Устану за любімую Літву!»

1942 г.

Пераклад Эдзі АГНЯЦВЕТ.

СТВАРАЛЬНІКІ «ЧАПАЕВА»

Яны не былі братамі. Сяргей Васільеў нарадзіўся ў Маскве, Георгій — у Волагдзе. Але дваццаціградовых хлопцаў-аднафамільцаў, якія прайшлі па дарогах грамадзянскай вайны і сустрэліся ў дваццатых гадах на адной з першых савецкіх кінафабрык, зблізіла і парадніла гарачае захапленне кінематографам, імкненне паспрабаваць сілы ў гэтым маладым тады мастацтве.

Упершыню «Браты Васільевы» паявіліся ў цітрах фільма «Подзвіг у льдах» («Белая тайна») амаль чатыры дзесяцігоддзі назад. Яны стварылі карціну на матэрыяле дакументальных здымак, якія адлюстравалі выратаванне савецкімі ледаколамі «Красін» і «Малыгін» палярнай экспедыцыі італьянца Нобіле. Вялікую ролю адыграў арыгінальны мантаж. Фільм карыстаўся поспехам. Адбіткам цікавага эксперымента адзначаны наступны фільм Васільевых «Спячая прыгажуня»...

Пра жыццё і працу выдатных савецкіх кінематаграфістаў апавядае новы поўнаметражны фільм «Браты Васільевы», пастаўлены рэжысёрам Дар'яй Шпіркан на студыі «Мосфільм». Сабраны і вельмі добра пракаменціраваны аўтарамі карціны вялікі кіна-фота- і іканаграфічны матэрыял дае магчымасць пранікнуць у творчую лабараторыю рэжысёраў.

Стварэнне сцэнарыя, а пасля і фільма «Чапаеў» патрабавала немалой падрыхтоўчай работы. Васільевы сустракаліся і гутарылі з відавочцамі падзей, наведвалі месцы баёў. Сваю мэту яны бачылі ў праўдзівым і дакладным паказе адной з гераічных старонак народнай барацьбы. Рэжысёры, робячы каласальную колькасць графічных накідаў, стараліся ўявіць сабе кожны кадр будучага фільма. Мы даведваемся пра цікавы факт: аказваецца, сёйтой настойваў на пастаноўцы карціны ў нямым варыянце. Але рэжысёры адстаялі сваю ідэю—Чапай павінен гаварыць! І гэта непамерна ўзмацніла эмацыянальнае ўздзеянне фільма, у якім у арганічны сплаў зітаваны выяўленчае выразшэнне, гук, мова, мантаж, рытм апавядання. Аб патрабавальнасці рэжысёраў да сябе гаворыць такі, напрыклад, факт. Георгій Васільеў сыграў у фільме невялікую ролю ад'ютанта белага палкоўніка Бараздзіна. Цяпер у карціне мы бачым эпізод, якога няма ў «Чапаеве»,—афіцэр ля раяля марыць пра вяртанне ў Маскву. Гэтыя кадры не былі ўключаны ў карціну, бо здаліся братам недастаткова выразнымі.

Закончаны «Чапаеў» — поспех яго вялікі—і зноў напружаная работа. Сустрэчы і гутаркі з выдатным бальшавіком Паўлам Постышавым падказалі тэму наступнага фільма—«Валачаеўскія дні», пра барацьбу за Савецкую ўладу супраць іншаземнай інтэрвенцыі на Далёкім Усходзе. І зноў рэжысёры імкнуліся расказаць пра гераічны час і яго людзей максімальна праўдзіва і вобразна.

У самыя цяжкія дні Айчыннай вайны браты Васільевы не спынялі актыўнай творчай работы, разглядаючы сваё мастацтва як зброю, якая памагае народу ў яго барацьбе з ворагам. У пачатку вайны святло экрана ўбачыў фільм «Абарона Царыцына». У 1943 годзе ў складаных умовах рэжысёры закончылі карціну «Фронт» па аднайменнай п'есе А. Карнейчука.

У пасляваенныя гады, калі з жыцця адышоў Георгій Васільеў, іх агульную справу вёў далей Сяргей Васільеў. Ён кіраваў здымкамі першага савецка-балгарскага фільма «Героі Шыпкі». Тэма была яму блізкая: бацька рэжысёра быў удзельнікам апісваемых у карціне падзей, вызваляў братоў-балгараў ад іншаземнага прыгнёту... Потым Сяргей Васільеў бярэцца за ўвасабленне сваёй даўняй задумы—стварэнне фільма пра Ільіча—натхніцеля і кіраўніка вялікай рэвалюцыі. І гэтая тэма была для рэжысёра глыбока «асабістая»: у рэвалюцыйныя дні ён быў сувязным у Смольным, не раз бачыўся з Ул. І. Леніным.

Фільм «У дні Кастрычніка», закончаны ў 1958 годзе, — апошняя работа Сяргея Васільева. Смерць застала рэжысёра ў момант, калі ён раздумваў над новым буйным творам — экранізацыяй рамана Льва Талстога «Вайна і мір»...

Дакументальная карціна «Браты Васільевы» стварае вобразы таленавітых мастакоў савецкага кінематографа, людзей вялікай перакананасці і высокага грамадзянскага абавязку, якія ўзнімалі ў сваіх фільмах найважнейшыя тэмы жыцця.

АДН.

САМАЯ МАЛЕНЬКАЯ СКРЫПКА

Жыхар украінскага горада Жмерынка Міхаіл Маслюк стварыў мноства мініяцюрных, сапраўды ювелірных рэчаў, якія здзівілі спецыялістаў прыгажосцю і дакладнасцю апрацоўкі, мікраскапічнасцю. Многія яго работы дэманстраваліся на выстаўках за рубяжом.

Нядаўна Міхаіл Маслюк здзівіў сваіх землякоў новым творам. Ён зрабіў скрыпку, якая свабодна змяшчаецца... на пазногці. Гэтым Маслюк уступіў у спаборніцтва з вядомым армянскім умельцам Эдвардам Казаранам, які зрабіў скрыпку даўжынёю ў 14 міліметраў. Аб работах армянскага майстра Маслюк даведаўся з прэсы. У скрыпцы Міхаіла Маслюка ёсць усе без выключэння дэталі сапраўднага інструмента, а даўжыня яе — усяго 11,5 міліметра.

АДН.

КОНКУРС ІМЯ МУСАРГСКАГА

Вясною музычная грамадскасць адзначала 125-годдзе вялікага рускага кампазітара, аднаго з самых выдатных прадстаўнікоў «Магутнай кучкі» Мадэста Пятровіча Мусаргскага.

Сёлета ў канцэртах і па радыё асабліва часта гучаць рамансы і песні кампазітара, урыўкі з яго опер. Не выпадковы і той факт, што гастролі Вялікага тэатра СССР у міланскім «Ла Скала» пачаліся операй Мусаргскага «Барыс Гадуноў».

У Маскве з 22 лістапада будзе праходзіць Усесаюзны конкурс вакалістаў імя Мусаргскага. У ім могуць прыняць удзел спевакі ва ўзросце ад дваццаці да сарака гадоў.

На конкурсе прагучаць рамансы і песні з вакальных цыклаў Мусаргскага, а таксама арыі з яго опер і опер двух іншых кампазітараў «Магутнай кучкі»—Рымскага-Корсакава і Барадзіна. Асобнае месца адведзена народнай песні, якая павінна быць выканана на мове таго народа, якому належыць.

У конкурсе будуць удзельнічаць спевакі з філармоній, оперных тэатраў, кансерваторый і калектываў мастацкай самадзейнасці дваццаці сямі гарадоў, прадстаўнікі дванаццаці розных нацыянальнасцей краіны.

Шаснаццаць вакалістаў (восем жанчын і восем мужчын) удастояцца звання лаўрэатаў і будуць спяваць у трэцім туры конкурсу, а таксама выступаць у заключным канцэрце, які адбудзецца 2 снежня ў Вялікай зале Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. У канцэрце прыме ўдзел Дзяржаўны аркестр кінематографіі пад кіраўніцтвам заслужанага артыста РСФСР Кірыла Кандрашына.

Да работы ў журы прыцягнуты вядомыя музычныя дзеячы краіны: Марк Рэйзен, Валерыя Барсава, Марыя Максакава, Наталля Раждзественская, Барыс Гмыра, Сяргей Лемешаў, Іван Казлоўскі, Зара Далуханава, Ніна Дорліяк, Анатоль Аляксандраў.

Ганаровым членам журы з'яўляецца цудоўная спявачка, Марыя Аленіна-д'Альгейм — адна з першых выканаўцаў вакальных твораў Мусаргскага як у Расіі, так і за мяжой.

У гутарцы з карэспандэнтам АДН старшыня журы, вядомы савецкі кампазітар, лаўрэат Ленінскай прэміі Георгій Свірыдаў сказаў:

— Сама арганізацыя конкурсу гаворыць пра тую вялізарную ўвагу, якая ў нашай краіне надаецца слаўнай спадчыне Мусаргскага. Папулярызацыя яго музыкі—гэта папулярызацыя музыкі народнай, народнай думкі і мовы народа. Ад імя журы я вітаю ўсіх будучых удзельнікаў конкурсу і жадаю ім паспяховага выступлення на адным з сур'ёзных музычных спаборніцтваў года.

АДН.

НОВЫ РАМАН Ч. СНОУ

Кожная новая кніга Чарльза Сноу—буйнага сучаснага англійскага празаіка, заўсёды выклікае цікавасць чытачоў. Днямі газета «Дэйлі экспрэс» апублікавала інтэрв'ю, дадзенае Чарльзам Сноу карэспандэнту гэтай газеты Пітэру Гросвенару. Інтэрв'ю датычыць новай кнігі Сноу «Калідоры ўлады».

Сноу (у Савецкім Саюзе выдадзены яго кнігі «Справа» і «Пара спадзяванняў», якія з'яўляюцца часткаю яго эпапеі «Чужыя і браты»—Рэд.). расказаў карэспандэнту наступнае:

«У маіх ранейшых раманах, такіх, як, напрыклад, «Магістры», дзе я расказваў пра універсітэцкае жыццё, я даваў, так сказаць, карціну дробнамаштабнай палітыкі. На гэты раз аднак я паспрабаваў асвятліць увесь працэс прыняцця рашэнняў на «ўрадавым узроўні».

Пітэр Гросвенар адзначае, што «калі і ёсць які-небудзь раман, прасякнуты глыбокім зместам, дык іменна такім раманам з'яўляецца новы твор Сноу».

Пэт ГРЭГАРЫ,
карэспандэнт ТАСС.

Лондан.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

17 лістапада

Першая праграма. 11.00—«Кодзін». Мастацкі фільм. 17.10—праграма перадач. 17.15—для школьнікаў. «Юныя сябры прыроды». Тэлевізійны часопіс. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20—«У паходзе за якасць». Пагаворым аб мэблі. 19.00—Ш. Чкадуа. «Жуля і Мажуля». Прэм'ера тэлеспектакля (М). 21.00—«Песні дружбы». Перадача, прысвечаная Міжнароднаму дню студэнтаў. Трансляцыя з Кіева. 21.10 — «На трэку». Кінанарыс. 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«Маладосць патрабуе міру». Перадача, прысвечаная Міжнароднаму дню студэнтаў.

Другая праграма. 17.05—праграма перадач (М). 17.10—для школьнікаў. «Шляхі да музыкі». Перадача з Ленінграда. 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.10—«Экран вялікай хіміі». Перадача са Свярдлоўска. 19.00—«Трывожная маладосць». Мастацкі фільм. 20.35—«Баржомская яліна». Кінанарыс. 20.45—канцэрт піяністкі Наталлі Цёмкінай. У праграме — творы Шапэна. 21,10—«Ад новага да новага». Кінанарыс. 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—літаратурны аўторак. Перадача з Ленінграда.

18 лістапада

Першая праграма. 11.00—«Трывожная маладосць». Мастацкі фільм. 17.20—праграма перадач. 17.25—для малышоў. «Як самому зрабіць цацкі». 17.55—тэлевізійныя навіны. 18.10—свет сёння (М). 19.00—Шоша. «А хіба хто-небудзь страляў?» Прэм'ера тэлеспектакля (М). 20.40—у свеце мастацтваў. «Дзяржаўнаму мастацкаму музею БССР—25 год». Вядзе перадачу навуковы супрацоўнік музея Паншына. 21.10—канцэрт цымбаліста Марка Шмелькіна. 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«У эфіры «Маладосць». «Антарктыда—наш дом». Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 16.55—праграма перадач. 17.00—для школьнікаў. «Паказваюць кінааматары» (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Мусаргскі». Мастацкі фільм. 20.15—«Сустрэча з талентамі». Кінанарыс. 20.50—«Дружба». Сумесны савецка-польскі тэлевізійны часопіс (М).

19 лістапада

Першая праграма. 16.45 — праграма перадач. 16.50—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Зайка-зазнайка». Спектакль Дзяржаўнага тэатра юнага гледача БССР. 18.10—тэлевізійныя навіны. 18.30—«Вартавыя міру». Перадача, прысвечаная Дню артылерыі (М). 19.00—«Белы караван». Мастацкі фільм. 20.30—для юнацтва. «60 мінут у краіне гадзіннікаў». Эстрадна-цыркавое прадстаўленне (М). 21.30—«Эстафета навін» (М).

Другая праграма. 16.45—праграма перадач (М). 16.50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. М. Лур'е, З. Пятрова. «Усё добра, што добра канчаецца». Лялечны спектакль (М). 17.20—для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.50—тэлевізійныя навіны (М). 18.00—«Навука—вытворчасці». Тэлевізійны часопіс. Перадача з Ленінграда. 18.30—дакументальны фільм «Голас сумлення». 19.00—«З пакалення байцоў». Ус. Вішнеўскі і кіно (М).

Агні вячэрняга факультэта.

Фота Ул. КРУКА.

СЭРЦА, У ЯКІМ МЕСЦІЦЦА ЦЭЛЫ СВЕТ

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

Аня — у жаночай. Калі ўсталёўвалася мяжа, хлопцы вярнуліся ў Міроўшчыну, а Аня засталася ў Нясвіжы.

Сухавеі былі ў вялікай крыўдзе на Савецкую ўладу: чырвонаармейцы забралі іхніх коней, якія стаялі ў Какорычах, а прадатрад — збожжа, схаванае ў Жавулках у лесніка Ермаліцкага. Старэйшы сын Сухавеяў Ваця трымаў у страху ўсю ваколіцу, біўся на вечарынках, прыставаў да дзяўчат, але ў хуткім часе падвярнуў галаву. Неяк у Рэмезаўшчыне было вяселле, Ваця там напіўся і забіў дзяўчыну з Пацеек (гэтае здарэнне апісана ў пралогу рамана «Ідзі, ідзі», дзе ёсць і «бандзюк» Толік). У часе калектывізацыі Сухавеяў раскулачылі і выслалі ў Котлас. Малодшы сын іхні Ярош некаторы час хаваўся ў лесніка Ермаліцкага, а потым уцёк за граніцу.

Гліцэра і Каролек страшэнна не любілі сваякоў з Міроўшчыны. Сухавеі не толькі скруцілі і не аддалі ім грошы, што пазычылі на зямлю, але і на кожным кроку стараліся ашукаць Раманоўскіх, Марыля ўсяляк абгаворвала братаву. У цяжкія гады нямецкай і польскай акупацыі Каролек з дочкамі Маняй і Ганнай часта вымушаны былі наймацца на работу ў Міроўшчыне, але ўсё роўна ласкі ў Сухавеяў не мелі. Неяк вясною бацька пайшоў пазычыць у іх пуд мукі з тым разлікам, што сам або дзяўчаты адробяць.

— Давай золата, то будзе мука, — адрэзаў пан Гжэгаж. — А на работу прыйдзеш, нідзе не дзенешся.

Калі памерла Гліцэра, ніхто з іх не прыехаў на пахаванне.

Таму нічога няма дзіўнага, што ў хаце Раманоўскіх часта нядобрым словам успаміналі Сухавеяў, расказвалі пра іх скнарлівасць і нечалавечнасць. Усё гэта асядала ва ўражлівым сэрцы Мікалая і пасля вылілася ў справядлівы і суровы прысуд свету ўласніцтва і эгаізму, у яркія вобразы кулакоў з хцівым і воўчым нутром.

У рамане «Трэцяе пакаленне» многае ўзята з побыту Міроўшчыны. Правобразам старога Скуратовіча стаў нелюдзімы і скваппы Гжэгаж Сухавей, яго жонка — гэта панская ахмістрыня Марыля, Толік — своеасаблівае «спалучэнне» Ваці з Ярошам Сухавеямі. Ёсць у творы мясціны, дакладна «спісаныя» з жывых прататыпаў: «Як ужо быў Скуратовіч за аканома ў пана, узяў сабе замуж панскую ахмістрыню»; або: «На фатаграфіі яна (жонка Скуратовіча. — С. А.) была год на дваццаць пяць маладзейшая. У яе чалавека вісеў на грудзях на камізэльцы шырокі ланцужок ад гадзінніка. Вываксаваныя боты на здымку выйшлі белыя. Жанчына была адзета пад тагачасную моду. Такое адзенне магла падараваць тады якая-небудзь пані сваёй улюбёнай ахмістрыні». Ёсць у рамане і малюнак Сухавеевай сядзібы ў Міроўшчыне: «Навокал быў лес — яліна і хвоя, толькі з аднаго боку поле злівалася з небам і ледзь відны былі з-за ўзгорка вярхі хатніх стрэх. Двор быў агароджаны старым частаколам. Старасвецкія дубы, магутныя, як каменныя горы, стаялі над мураваным скляпком. Насупраць склепа адчынена была шырокая стайня».

Забягаючы наперад, скажам, што ў часе Айчыннай вайны Кузьма Чорны ў рамане «Вялікі дзень» зноў вярнуўся да сямейнай хронікі Сухавеяў. Тут у вобразе Ксавэра Блецькі адчуваецца Гжэгаж Сухавей, сын яго Адам таксама мае многа агульнага і з Вацем-забойцам і Ярошам — перабежчыкам за мяжу.

Аднак пэўныя прататыпы, рэальныя факты і жыццёвыя ўражанні так прапушчаны ў кожным выпадку па-новаму праз творчую лабараторыю пісьменніка, так асветлены мастацкім домыслам, што на адным і тым жа матэрыяле выраслі два выдатныя раманы, розныя па сваёй філасофскай канцэпцыі і ідэйнай задуме.

Вялікае ўражанне на сям'ю Раманоўскіх зрабіла такое здарэнне. Неяк у 1918 ці 1919 годзе памёр дзед Фэлька. Стары вельмі ганарыўся сваёю Марыляю (бач, няўрокам, паняй стала!), пагражаў пераехаць жыць у Міроўшчыну, часта туды хадзіў, але хутка вяртаўся назад: дачцы не патрэбен быў хворы бацька. Калі ж Фэлькі не стала, дык хвалёная багатырка Марыля мігам прыджгала ў Цімкавічы па бацькавы спадкі. Каролька з Мікалаем яшчэ рабілі труну, а Сухавеі падступалі да горла: аддайце бацькаву вопратку. Гэтая сцэна па-свойму вар'іруецца ў раманах «Сястра» і «Зямля», а таксама ў аповесці «Лявон Бушмар»: «...Сварыліся ў хаце за старую вопратку, што асталася пасля нябожчыка, бацькавага бацькі. Прыходзіла па вопратку бацькава сястра, бацька ж рваўся ўсё прагнаць яе з хаты. Тая вопратка можа і каштавала ўсяго якую двузлотку, а колькі было сказана з-за яе ўсялякіх крыўдных слоў». Дарэчы, характарыстыка бацькі Лявона Бушмара «спісана» з дзеда Фэлькі: «Гэта быў стары моцны, як дуб. Пражыў ён на свеце год, мусіць, з дзевяноста і рабіў усё да самых апошніх дзён сваіх. Доктара пры ім не было ніколі, ад самых малых дзён і аж да сканання. Не любіў ён доктарскіх лекаў, зваў гэта прымхаю, панскаю выдумкаю... Не верачы ў дактароў, ён гаварыў, што чалавек павінен як мае быць працаваць, колькі трэба выспацца, умеру, смачна з'есці — і тады будзе здароў».

Працаваў Кузьма Чорны ў 30-я гады многа і старанна. Не паспяваў ён закончыць адзін раман, як у галаве нараджалася і выношвалася новая задума.

Пісьменнік лічыў сваім абавязкам кожны год пабываць у родным мястэчку, паслухаць цімкаўскія навіны, пабачыць, скажам, Івана Касікоўскага, пасядзець на Уладзікавай прызбе. Дастаткова было Кузьму Чорнаму некалькі дзён падыхаць цімкаўскім паветрам, як ён набіраўся творчай зарадкі на цэлы год.

Але бываць у Цімкавічах становілася цяжэй і цяжэй. Роднае мястэчка апынулася на самай граніцы. Усё ж летам 1937 года Кузьма Чорны паехаў глянуць на дарагія і любыя сэрцу мясціны.

Пасля пажару Цімкавічы адбудоўваліся па-новаму. Бацька пісьменніка паставіў хату не на Фэлькавым аселішчы, а на Слуцкай вуліцы, у Прысадах. Змяніліся і ваколіцы. Да самага мястэчка падышла чыгунка, а вузкая каляя ад станцыі Цімкавічы сiганула яшчэ далей — на Вялікую Раёўку.

Кузьма Чорны схадзіў на кірмаш паглядзець калгасны дастатак, паслухаць кірмашовыя размовы, пабачыць даўніх знаёмых. Там ён сустрэў Івана Кулеша з Пузава, які працаваў старшынёй калгаса ў роднай вёсцы. Выпілі па чарцы, разгаварыліся, успомнілі мінулае, калі разам хадзілі ў школу.

Пасля Чорны з'ездзіў у Быстрыцу да брата-настаўніка. Павёз яго туды апошні цімкаўскі аднаасобнік — сам Іван Касікоўскі.

У Мінск не хацелася вяртацца. Там панавалі трывога і неспакой. Кожны дзень прыносіў страшэнныя весткі пра новыя і новыя арышты сярод партыйных дзеячоў, вучоных і пісьменнікаў. У турме сядзелі Цішка Гартны, Міхась Чарот, Платон Галавач, Уладзімір Хадыка. Ярлыкі «вораг народа», «нацдэм», «польскі шпіён» увачавідкі прыклейваліся ўвішнымі падбрэхічамі да імён сумленных літаратараў.

Адзінае збавенне ад сумнага і дрэннага настрою было ў творчай працы. Трэба было часам мець вялікую сілу волі, каб прымусіць сябе сесці за пісьмовы стол. Але пісьменнік браўся за пяро, і перад ім з'яўляліся неспакойныя, гаваркія цімкаўцы...

Захварэла жонка, і Кузьма Чорны позна ўвечары 13 кастрычніка 1938 года пайшоў у аптэку па лекі і дамоў не вярнуўся: яго арыштавалі ля пад'езда дома. Жонка не ведала, што з ім здарылася, але неўзабаве ноччу прыйшлі рабіць вобыск: перавярнулі кнігі, рыліся ў рукапісах і забралі іх з сабою.

У турме пісьменнік перажыў страшэнныя маральныя і фізічныя пакуты. Абвінавачанне было недарэчнае і дзікае: хацеў забіць... Варашылава. Для гэтага нібыта ездзіў у пагранічныя Цімкавічы, каб атрымаць адпаведныя інструкцыі ад чалавека, які назваў сябе старшынёю калгаса. З дня ў дзень цягнуліся здзеклівыя допыты і цяжкія катаванні.

Раптам 8 чэрвеня 1939 года расчыніліся дзверы камеры, і Кузьма Чорны вярнуўся дамоў.

Зноў над галавою сіняе неба. Пахне зямля травою, лісцем. Ласкавае сонца свеціцца ў вачах дачушкі, чуецца не смех. Зноў хочацца расказаць смешную гісторыю пра цімкаўцаў, пачуць Касікоўскага:

— Пазыч мне, тымчасове, гэта во...

— Чаго гэта во! Гавары выразней!

— Прымернае дзела, долата...

Хацелася наведаць роднае мястэчка, каб пасядзець ля бацькавай магілы. Небарака! Ён усё жыццё пражыў для дзяцей, стараўся, каб яны пайшлі ў людзі. Калі Каролек пачуў пра арышт сына, то ўнылу душою, вялікае ўтрапенне ахапіла яго сэрца. Стары праседзеў у роздуме каля акна, потым неяк як сам не свой звязаў венік, лёг спаць і больш не прачнуўся... Здарылася гэта яшчэ 26 снежня 1938 года.

Пакрысе загойваліся душэўныя раны. Пакутлівыя турэмныя дні аставаліся ў памяці як страшэнны сон-трызненне.

На стале пісьменніка ўсё часцей і часцей з'яўляліся кветкі. Сямейнікі ведалі: калі паставіў кветкі, дык, значыцца, у Мікалая Карлавіча такі настрой, калі добра пішацца і думаецца...

Пасля — вайна. У полымі пажару загінула праца апошніх год — рукапісы рамана «Простыя людзі» і няскончаных твораў — «Вялікае выгнанне» і «Судны дзень». Прыйшла трывога за родную зямлю, за тых, хто астаўся там, за фронтам.

Зноў упартая, дзень у дзень, творчая праца. Артыкулы і нарысы, фельетоны і памфлеты, апавяданні і аповесці. Паралельна — праца над раманамі «Вялікі дзень» і «У пошуках будучыні», у якіх зноў ажылі знаёмыя і дарагія цімкаўцы, зноў перад вачыма родная Случчына.

Нейкае асаблівае замілаванне з'яўлялася тады ў сэрцы пісьменніка да родных беларускіх палеткаў. «Вернемся на родную зямлю, па-новаму ацэнім вялікае шчасце жыць на ёй», — пісаў Кузьма Чорны ў лісце да Якуба Коласа.

Раптам новая бяда: 24 лістапада 1942 года цяжкая хвароба звaліла з ног, выбіла надоўга з творчай каляі. Але амаль праз год, 18 верасня 1943 года, Чорны завяршыў працу над раманам «У пошуках будучыні». У працы забыццё ад смутку па радзіме, у працы ўцеха, праца набліжае радасны дзень звароту на радзіму.

2 ліпеня 1944 года, калі Савецкая Армія была на подступах да Мінска, Кузьма Чорны напісаў першую старонку дзённіка. У ім радасць, што канчаюцца пакуты акупацыі, глыбокі роздум над жыццём, літаратурай, творчыя планы, жаданне пісаць і пісаць.

Вялікую радасць прынесла першая вестка з родных Цімкавіч. Сёстры, якія былі партызанскімі сувязнымі, пісалі пра сваё жыццё і барацьбу землякоў з нямецкімі захопнікамі. Пісалі яны і пра пажар, у якім згарэла бацькава хата.

Сэрца пісьменніка рвалася на радзіму, і 22 верасня 1944 года ён прыехаў з сям'ёю ў Мінск. Горад быў страшэнна знявечаны—адны руіны і папялішчы. Прыйшлося часова прытуліцца ў бакоўцы Саюза пісьменнікаў, які размяшчаўся тады на вуліцы Берсана. Перш-наперш Кузьма Чорны пайшоў адведаць Мухамораў — сваіх колішніх гаспадароў, у якіх ён жыў у студэнцкія часы.

У канцы кастрычніка пісьменнік атрымаў кватэру на вуліцы Свярдлова. Кватэра гэтая для восені 1944 года была нядрэнная, але перад самымі вокнамі стаяла напаўразбураная муравaнка, аблезлыя сцены якой нагадвалі Кузьму Чорнаму турэмную камеру. Прыходзілася завешваць вокны так, што ў пакой не заглядала і скупое асенняе сонца.

— Вось перазімую і паеду ў Малыя Прусы да Лявона Жука, — пацяшаў сябе Кузьма Чорны. — Там лес кругом і Цімкавічы блізка...

Але не давялося яму здзейсніць свой намер. 22 лістапада ён зрабіў запіс у дзённіку, узяўся за аповесць «Скіп'еўскі лес». Пісалася ў той дзень нешта вельмі марудна, нейкая трывога і ўзбуджанасць не давалі спакою. На стале астаўся недапісаны сказ. Пісьменнік сабраўся пайсці ў горад і раптам адчуў сябе дрэнна. А падвечар ён памёр...

Перастала біцца вялікае сэрца, сэрца, у якім мясціўся цэлы свет.



У АСЕННІМ НЕБЕ.

Фотаэцюд В. ЖДАНОВІЧА.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Калектыў часопіса «Вожык» выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму рэдактару часопіса Кавалёву П. Н. з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 03206.